№ 43 (593) 20 лістапада 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

### Новая антыкарупцыйная палітыка

За карупцыйныя скандалы ад пасад адхілены шэраг высокіх чыноўнікаў і адыёзных судзьдзяў.

Старонка 5

### Айцец Аляксандар Надсан

Духоўны аўтарытэт беларусаў сьвяткуе паўстагодзьдзя сьвятарскай дзейнасьці.

Старонка 10

### Нябесныя ваўкі

Новы ўздым незалежніцкіх рухаў у Паволжы.

Старонка 6

## У НУМАРЫ

**Сідорскаму спадабалася**

Мэтай І Беларускага інвэстыцыйнага форуму ў Лёндане было знаёмства прадстаўнікоў сусьветнага бізнэсу зь інвэстыцыйнымі магчымасьцямі Беларусі, а нашых урадоўцаў — з сусьветным бізнэсам. **Старонка 4.**

**МЗС: Лукашэнку пра «Іскандэры» ня так зразумелі**

Афіцыйны Менск пасьпяшаўся заверыць, што Беларусь ня мае ніякага намеру адказваць на амэрыканскую батарэю ПРА ў Польшчы. **Старонка 2.**

**Мужчынская палата**

За некалькі дзясяткаў мэтраў ад галоўнага праспэкту сталіцы стаіць зусім сьціплы будынак, куды ня водзяць экскурсіі. Віталь Тарас. Эсэ. **Старонка 2.**

**Атлянт пакінуў неба**

У Менску, Вільні, Кракаве і Варшаве, у картках узятых для прагляду рукапісаў, нязьменна знаходзіцца подпіс Генадзя Кісялёва. А хто пасьля яго? **Старонка 13.**

**Вэрсаль. Byelorussia**

На здымках Сямёна Печанка – першы плён рэстаўрацыі ружанскага палацу Сапегаў. **Старонка 9.**

# Яўленьне Макея народу



PHOTO BYMEDIA.NET

**Удзельнікі беларуска-нямецкага «Менскага форуму» мелі магчымасьць назіраць новага кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Уладзімера Макея. І ня проста назіраць, а пачуць ягоны выступ. І ня толькі выступ, але і адказы на пытаньні Садоўскага, Парсюкевіча, Шумчанкі. Піша Барыс Тумар. Старонка 3.**

## Нацбанк зьбіраецца «мякка дэвальваваць рубель»

Нацыянальны банк плянуе праводзіць паэтапную дэвальвацыю беларускага рубля, прывязанага да кошыку валют. Пра гэта заявіў у Лёндане намесьнік кіраўніка галоўнай фінансавай установы краіны Васіль Мацюшэўскі, паведамляе TUT.BY са спасылкай на Reuters. «У наступным годзе мы плянуем больш гнуткую курсавую палітыку. Мы намераны мякка дэвальваваць нацвалюту», — сказаў Мацюшэўскі.

Аднак ён не ўдакладніў, якімі тэмпамі будзе ажыцьцяўляцца дэвальвацыя. Але зьвярнуў увагу на зьніжэньне курсу расейскага рубля ў Расеі на 1% на мінулым тыдні і на пляны Масквы працягнуць зьніжэньне курсу рубля ў далейшым.

Як паведаміў TUT.BY начальнік упраўленьня інфармацыі Нацбанку Анатоль Драздоў, «мяккая дэвальвацыя ўжо ідзе». Курс нашага рубля ў дачыненьні да даляра ЗША паступова зьніжаецца, аднак да канца году ён будзе ўтрымлівацца ў рамках устаноўленага Нацбанкам валютнага калідору — у межах 2 100—2 200 рублёў.

Што тычыцца 2009 году, то тут магчымыя ваганьні ў межах 5—10%.

**tut.by**

### «НН», «ARCHE» працягваюць турнэ: Глыбокае, Наваполацак, Горадня

**31 лістапада, 14.00. Віцебск.** Даведкі праз т.: (029) 651-32-53, 517-32-53.

**Утой самы дзень 19.00. Глыбокае, у касьцёле.**

**1 сьнежня, 19.00. Наваполацак, Таварыства беларускай мовы.**

**4 сьнежня, 18.30. Горадня. Памяшканьне Таварыства Беларускай Школы на вуліцы Будзённага, 48а.**

Спатканьні будуць прысьвечаныя розным сюжэтам. Будзе прэзэнтавацца Збор твораў ксяндза Адама Станкевіча, што выйшаў у выдавецтве ARCHE, адбудуцца прэзэнтацыі нумару часопісу ARCHE, прысьвечанага Вялікаму Княству Літоўскаму і дарасейскай гісторыі Беларусі. Прыедуць рэдактар часопісу В.Булгакаў, рэдактары газэты «Наша Ніва» Андрэй Дынько і Андрэй Скурко, гісторык Алесь Пашкевіч, гарадзенскія і менскія аўтары ARCHE і «Нашай Нівы». Будзе працаваць выстава беларускіх кніжак. Сустрэчы пройдуць у рамках кампаніі «Будзьма!». Запрашаюць ўсе ахвотныя.



КАМЭНТАР

# Да бягучага палітычнага моманту

Піша **Андрэй Павач**.

Я гляджу на сытуацыю ў нашым грамадзтве аптымістычна. Мы перажылі выключна цяжкія часы татальнага непрызнаньня нацыянальных каштоўнасьцяў, іх вынішчэньня, але працягвалі існаваць. Зачапіўшыся пасьля 1995 году літаральна на ўскрайку прорвы, мы ў духоўным сэнсе не здалі ніводнай нашай пазыцыі. Мы штогод упарта зьбіраемся 25 Сакавіка, ушаноўваем Дзяды і магілы нашых герояў, упарта даказваем уладам сваё права на ўнутраную аўтаномію. Адным словам, мы ёсьць і нам ёсьць ад чаго адштурхнуцца, ёсьць што прапанаваць дзяржаве. З ironіяй цяпер успамінаюцца спробы некаторых нашых палітыкаў дэмакратызаваць Беларусь з дапамогай Расеі, грамадзтву якой, як выявілася, куды далей да дэмакратыі і ўсьведамленьня сваёй нацыянальнай ідэі, чым беларускаму.

Яшчэ Алексіс дэ Таквіль у сваёй працы «Стары лад і рэвалюцыя» сьцьвердзіў, што рэвалюцыя заўсёды прыходзіць тады, калі ўлады крышачку, бы так мовіць, «адпускаюць лейцы». Што прымушае ўладу рабіць спробы выпусьціць пару з грамадзкага катла — іншая справа, аднак рацыі француза не прызнаць нельга: рэвалюцыі, і ў Францыі XVIII-га, і ў Расеі XX-га, і ва Ўкраіне XXI-га стагодзьдзяў былі рэакцыяй грамадзтва, якое ўжо адчула смак пэўнай свабоды, на спробу зноў закруціць гайкі.

Ня буду спрачацца, да якой ступені гатовыя «дэмакратызавацца» і тым больш «абеларушвацца» цяперашнія ўлады, аднак дзьве рэчы пэўныя. Па-першае — спробы стварыць хаця б для замежжа карціну незалежніцтва цяперашніх уладаў будуць мець месца. Па-другое, будуць да апошняга трымаць усе «дэмакратызацыйныя» працэсы пад кантролем.

Яскравы доказ першага — чуткі пра скачок Паўла Латушкі з пасады пасла ў Польшчы ў Адміністрацыю А.Лукашэнкі. Колішняму беларускамоўнаму прэс-сакратару МЗС прыгатавана роля галоўнага прапагандыста «лукашызму ў нацыянальнай кашулі». Характэрна, што пайшлі і чуткі пра будучы перавод на беларускую мову паловы перадач тэлебачаньня.

Аднак ня плёткі мяне цікавяць. Спакою не дае іншае — на што выявіцца здатным незалежнае беларускае грамадзтва, каб у спрыяльнай каньюнктуры вырваць для сябе значнае месца на грамадзкай і, магчыма, нават палітычнай арэне? Сёньня гэта пытаньне нумар адзін.

Апазыцыя расколатая, заграззлая ў танным крытыканстве.

Сёньня патрэбны сапраўды ўсеграмадзкі сход, які скончыць нарэшце ідыёцкія сваркі і сфармулюе асноўныя патрабаваньні, якіх трэба дамагацца. Патрабаваньні гэтыя ясныя: свабода выданьня і распаўсюду незалежнай прэсы, дазвол на стварэньне і свабоднае функцыянаваньне грамадзкіх арганізацый і палітычных партый, вяртаньне ў школьную адукацыю беларускамоўнага навучаньня гісторыі… Акрамя як згуртавацца, іншага выхаду ў апазыцыі няма. Можна, вядома, хітравата пасьміхацца і ўпэўнена пераконваць найперш самых сябе ў тым, што хутка адліга скончыцца, а Эўропу чакае чарговы вялікі аблом, аднак падобная пазыцыя — гэта пазыцыя ня здатнага ні на што паўплываць назіральніка.

Стаўкі высокія. Лукашэнкаўцы распачалі рэформы. Яны спрабуць стварыць бачнасьць існаваньня незалежнага ад уладаў «грамадзкага сэктару», які быццам падтрымлівае і радасна адабрае ўсе пачынаньні ўладаў. Адмоўчваючыся, нічога ня робячы, мы можам страціць нават тое нямногае, што маем сёньня.



# Крок наперад, два крокі назад

На офісе Мілінкевіча апісалі маёмасьць.

18 лістапада судовыя выканаўцы зь Першамайскага раёну сталіцы апісалі маёмасьць на офісе «Руху «За Свабоду». Афіцыйная падстава для апісаньня маёмасьці: 10 гадоў таму на гэтай кватэры пражываў чалавек, у дачыненьні да якога была заведзеная крымінальная справа.

Паводле выканаўцаў, у кватэры могуць знаходзіцца рэчы, якія належалі таму самаму гаспадару. Апісалі мэблю, кампутары, а таксама стары антыкварны гадзіньнік, падораны былому кандыдату ў прэзыдэнты. Посуд не чапалі, жартуе Мілінкевіч.

Лідэр «Руху «За Свабоду» адзначае, што гэты інцыдэнт сьведчыць пра барацьбу груповак у атачэньні Лукашэнкі: «Гэта можа быць ініцыявана тымі людзьмі, якія супраць пераменаў у нашай краіне, наладжваньня кантактаў з Захадам, лібэралізацыі эканомікі».

**Зьміцер Панкавец**

# МЗС: Лукашэнку пра «Іскандэры» ня так зразумелі

Афіцыйны Менск пасьпяшаўся заверыць, што Беларусь ня мае ніякага намеру адказваць на амэрыканскую батарэю ПРА ў Польшчы.

Прэс-сакратар міністэрства замежных справаў Андрэй Папоў заявіў, што ў матэрыяле ў газэце Wall Street Journal была дапушчаная няслушная інтэрпрэтацыя словаў кіраўніка Беларусі. Гэта датычыць выказваньняў адносна плянаў ЗША па разгортваньні сыстэмы ПРА ў Эўропе і дзеяньняў у адказ Расеі, уключна з разьмяшчэньнем комплексаў «Іскандэр».

Папоў адзначыў, што скажэньне сэнсу выказваньняў Лукашэнкі прывяло да мноства дадумак, якія сталі падставай для няправільных ацэнак ня толькі сярод экспэртаў, але і ў палітычных колах розных дзяржаваў.

«У сувязі з гэтым хачу заявіць, што лідэр Беларусі не рабіў ніякіх заяваў пра намеры нашай краіны разьмясьціць расейскія ракетныя комплексы «Іскандэр». У гэтым лёгка пераканацца, калі зьвярнуцца з стэнаграмай інтэрвію Лукашэнкі газэце Wall Street Journal, разьмешчанай на сайце кіраўніка Беларусі», — адзначыў А.Папоў.

Далей адзначаецца, што ў рамках праграмы пераўзбраеньня войска старыя ракетныя комплексы паступова замяняюцца на новыя, у тым ліку, магчыма, і «Іскандэры», але гэта нават «ня пляны заўтрашняга дня».

Напярэдадні афіцыйны прадстаўнік Дзярждэпартаменту ЗША Робэрт Вуд заявіў, што разьмяшчэньне расейскіх ракетных комплексаў «Іскандэр» на тэрыторыі Беларусі ня будзе спрыяць захаваньню стабільнасьці ў эўрапейскім рэгіёне.

«Мы ўжо шматразова заяўлялі, што сыстэма ПРА не скіраваная супраць Расеі або Беларусі», — сказаў Р.Вуд.

**ЗП**

СЬЦІСЛА

**Гомельскі прыклад**

Двое жыхароў Гомелю, у якіх узялі адбіткі пальцаў, даведаўшыся, што справа гэтая добраахвотная, напісалі заявы ў РУУС. Кіраваліся яны законам пра дзяржаўную дактыляскапічную рэгістрацыю, які, у выпадку адпаведнага звароту грамадзянаў, перадугледжвае зьнішчэньне вынікаў рэгістрацыі цягам месяцу.

Жыхары Гомелю, якія наважыліся на гэтую справу, атрымалі афіцыйныя паведамленьні з РУУС пра зьнішчэньне іхных адбіткаў пальцаў.

**Прэмія Каролю**

Шэф-рэдактар газэты «Новы час» Аляксей Кароль узнагароджаны прэміяй імя Найта за якасную журналістыку ў цяжкіх умовах. Цырымонія адбылася 12 лістапада ў Вашынгтоне. На вечарыне прысутнічаў таксама часовы паверанны па справах ЗША ў Беларусі Джонатан Мур.

**БРСМ супольна з «Маладым фронтам»**

…беларусізуюць Кобрын. Найперш, БРСМ будзе дапамагаць праводзіць у гарадах мерапрыемствы ў межах кампаніяў «Беларускую кнігу — дзецям!», «За МТС пa-беларуску!», арганізоўваць сустрэчы з гісторыкамі і грамадзкімі дзеячамі, праводзіць дыскатэкі зь песьнямі на роднай мове.

**Трапіць на БАТЭ — «Рэал» хоча больш за 100 тысячаў чалавек**

Арганізатары футбольнага матчу БАТЭ — «Рэал», які пройдзе 25 лістапада на менскім стадыёне «Дынама», атрымалі каля 100 тысяч заявак на білеты. Пры гэтым сталічная арэна можа прыняць толькі крыху больш за 30 тысячаў чалавек. 19 лістапада, калі пачалі прадаваць квіткі, ля касаў стадыёну «Дынама» ўтварылася кіляметровая чарга.

**ЗП, СП; «Эхо Москвы», БелаПАН, mfront.net**

# Мужчынская палата

**Віталь Тарас**. Эсэ.

**Горад жанчынаў**

За некалькі дзясяткаў мэтраў ад галоўнага праспэкту сталіцы, які Артур Клінаў ахрысьціў Горадам Сонца, убаку ад велічнага гмаху з калёнамі, стаіць зусім сьціплы будынак, куды ня водзяць экскурсіі. Гэта шпітальны будынак. Але ганарыцца перад замежнікамі тут няма чым — у архітэктурны ансамбль паміж Палацам Рэспублікі і Нацыянальнай бібліятэкай будынак яўна ня ўпісваецца. Тут, у шпітальных палатах з струхлелым лінолеўмам на падлозе і аблупленай фарбай на сьценах, ляжыць па пяцьшэсьць чалавек у кожнай. А ў прыбіральнях цякуць унітазы з адвечна паламанымі зьліўнымі бачкамі…

Адзіная замежная дэлегацыя, якую тут можна ўявіць, — гэта дэлегацыя фэміністак заходніх краінаў. Яны, напэўна, засталіся б задаволеныя. Ня тым фактам, зразумела, што ў аддзяленьні анкахірургіі лекуецца агромністая колькасьць жанчынаў, якім тут аднімаюць грудзі. І ня тым, што маладшы й сярэдні мэдычны пэрсанал складаюць выключна жанчыны. А тым, што сярод прадстаўнікоў прафэсіі, якая раней лічылася выключна мужчынскай, — хірургаў, усталяваўся амаль поўны парытэт. Жанчыны робяць тут штодня хірургічныя апэрацыі з такой самай цьвёрдасьцю й прафэсійнай бязьлітаснасьцю, што і іхныя калегі мужчынскага полу.

Часам у вузкім калідоры хірургічнага аддзяленьня можна сустрэць сапраўды фэлініеўскіх пэрсанажаў. Напрыклад — жанчыну сталага веку зь сьлядамі былой прыгажосьці на твары, якую возіць у інвалiднай калясцы сядзелка. Жанчына ўвесь час мырмоча нешта неразборлівае, амаль мыкае, але часам прамаўляе асэнсаваныя фразы, кшталту «паехалі наперад!». У жанчыны памёр каханы муж, пасьля чаго яна захварэла з гора. Сын, які жыве ў ЗША, рэгулярна высылае маці 200 даляраў на сядзелку.

Працяг на старонцы 8.

# Яўленьне Макея народу

Удзельнікі беларуска–нямецкага «Менскага форуму» мелі магчымасьць назіраць новага кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Ўладзімера Макея. І ня проста назіраць, а пачуць ягоны выступ. І ня толькі выступ, але і адказы на пытаньні Садоўскага, Парсюкевіча, Шумчанкі. Піша **Барыс Тумар**.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Анатоль Шумчанка: «Уладзімер Уладзімеравіч, рашыце нашы праблемы».**

Інтрыга была тым большаю, што Макей публічна выступае вельмі рэдка, а на недзяржаўнай пляцоўцы — і зусім. Між тым яго называюць чалавекам нумар тры ў сёньняшняй гіерархіі лукашэнкаўцаў, пасьля ўласна Аляксандра і Віктара Лукашэнкаў. І менавіта зь ім, былым савецкім выведнікам, а пасьля РБэшным дыпляматам, зьвязваюць цяперашні курс на прымірэньне з Эўрасаюзам. Урэшце, ён стаў першым кіраўніком Адміністрацыі, які наведаў «Менскі форум».

Макей нэрваваўся.

Седзячы пад прыцэлам фотакамэраў, ён то цёр нос, то торгаў вуха, то прыкрываў вусны кулаком. Было відаць, што яму нязвыкла выступаць публічна. Амаль усю сваю прамову ён прачытаў з паперкі, прычым безь вялікага выражэньня, бясколерна. Без шпаргалкі ён толькі трохі прамовіў па-нямецку пры канцы свайго выступу.

Прамова была вытрыманая ў абарончым стылі. Ён гаварыў пра:

падвойныя стандарты;

12 страчаных гадоў для беларуска-эўрапейскіх адносінаў;

немагчымасьць зрабіць кальку з заходняй дэмакратыі ў іншых краінах, да таго ж у адначас;

сацыяльную стабільнасьць;

барацьбу з наркатрафікам і гандлем людзьмі;

свабоду СМІ, якую трэба вызваліць ад клішэ;

супольны гістарычны досьвед Беларусі і Германіі;

Калі Макей нагадаў пра пастаўленую прэзыдэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам задачу ў кароткія тэрміны вывесьці Беларусь у трыццатку самых разьвітых дзяржаваў сьвету, спадарыня Т. у апошнім шэрагу захіхікала.

«Мы, эўрапейцы, маем...», — зьвярнуўся да нямецкіх гасьцей Ул.Макей,

і лёгкае замілаваньне расплылося пад вусікамі пасла Гебгарда Вайса, што сядзеў на подыюме разам з праф. Райнэрам Лінднэрам, нязьменным рухавіком «Менскага форуму».

Напачатку ў голасе Макея празьвінела некалькі пуцінскіх нотак, пасьля падрыхтаваны тэкст зьбіўся ў звыклую танальнасьць пасла гордае цэнтральнаазіяцкае сатрапіі дзе-небудзь у палацы Шонбрун пры АБСЭ. Аднак, выкрыўшы падкопы і зьняўшы ілюзіі, Макей не закляйміў Захад як галоўную пагрозу духоўнасьці, а заклікаў перайсьці ад эры канфрантацыі да эры дыялёгу і зганіў аджылую блёкавую сьвядомасьць, прапанаваўшы заходнім партнёрам «без палітычных ярлыкоў зірнуць на Беларусь».

У сваім выступе Макей цытаваў Актавіё Паса і Конрада Адэнаўэра, прычым апошняга — на мове арыгіналу. Ён адзначыў бягучы год як год 90-годзьдзя скончаньня Першай сусьветнай.

Пасьля яго слова наноў перайшло да вядоўцы, прафэсара Лінднэра, які нагадаў, што гэта таксама год дваццацігодзьдзя адкрыцьця праўды пра Курапаты, якое перавярнула сьвядомасьць беларусаў, і стварэньня Народнага Фронту, які на сёньня ёсьць найстарэйшай апазыцыйнай палітычнай арганізацыяй Усходняй Эўропы. Такі быў пачатак дыскусіі — яна анансавалася, але ўсё адно засьпела аўдыторыю зьнянацку. Народ адвык весьці спрэчку, пагатоў — з кіраўніком Адміністрацыі. Узьнікла паўза, якую запоўніў немец з абмежаванымі фізычнымі магчымасьцямі — ён хацеў наведаць Хатынь, але аказалася, што мэмарыял недаступны для такіх, як ён, вазочнікаў.

Другім слова ўзяў першы пасол Беларусі ў Нямеччыне Пятро Садоўскі. «Маё пытаньне простае як тры рублі. Калі мы зможам набываць «Народную волю» ў шапіках?» Заля запляскала, Макей сумеўся, вытрымаў паўзу і адказаў па-беларуску, што «пазытыўныя крокі будуць абавязкова, і яны будуць датычыць таксама сытуацыі на мэдыйным рынку».

Тады на трыбуну выскачыла чарнявая дзяўчынка ў пацёртых джынсах. Я ня ўдзельніца форуму, сказала яна, мы сюды зь сябрамі прыйшлі пікетам, каб нагадаць пра Баразенку і яшчэ дзесяць палітвязьняў па справе 14-ці. Нас спадар Лінднэр запрасіў увайсьці, і вось я таксама з гэтай трыбуны кажу: няма ніякай лібэралізацыі, пакуль гэтыя людзі не рэабілітаваныя.

«А я Парсюкевіч», — выйшаў сьледам за ёю да мікрафону былы палітвязень… І давай праўду-матку рэзаць. Нарэзаў-нарэзаў і застаўся стаяць за пюпітрам. Маўляў, патрабую адказу.

Лінднэр заўважна ня ведаў, што рабіць, заля шыбуршэла, Макей узяў сябе ў рукі:

«Палітвязьняў у нашай краіне не было і няма. Ёсьць жаданьне прыпісаць палітычныя матывы асобам, якія былі пакараныя па тых ці іншых крымінальных справах. Але закон адзін для ўсіх. Закон можа і не адпавядаць тым дэмакратычным рэаліям, якія павінныя быць. Тады яго трэба мяняць. Але пакуль ён ёсьць, яго трэба выконваць».

Дыскусія яўна выходзіла скамечаная, як пінжак, што трынаццаць гадоў праляжаў у валізе. Слова стаў патрабаваць прадпрымальнік Шумчанка. Лінднэр, баючыся канчатковага перарастаньня прыгожае задумы ў палітычную перапалку, сьціпла спрабаваў Шумчанку спыніць, ды дзе там! У цёмных акулярах і з жуйкай у роце, той заняў пазыцыю за трыбунай і давай гаварыць пра будучы мітынг прадпрымальнікаў. «Уладзімер Уладзімеравіч, толькі на вас надзея. Рашыце нашы пытаньні, каб нам не выходзіць на вуліцу. Ці маглі б вы прызначыць нам сустрэчу?» — прасіцельна перакрычаў Лінднэра прадпрымальніцкі важак. Макей яўна чакаў горшага і павесялеў: «Хто яшчэ мае да мяне просьбы? — пажартаваў ён. — А ўвогуле прадпрымальнікамі я не займаюся, але пытаньне пра меры для іхнай падтрымкі таксама будзе на разглядзе ў прэзыдэнта».

Вось такім ён аказаўся, Макей — недасьведчаным аратарам і дасьведчаным дыпляматам. А мог жа Макей і не прыйсьці да немцаў… Нават нагода была, каб не прыйсьці — новая антыкарупцыйная пачалася; пракуратура, суды, МУС, аказваецца, у нас павязаныя парукай.

Не да месца чамусьці ўспомнілася, як на прамінулы форум завітаў Уладзімер Канаплёў. Таксама выступіў.

### Менскі форум

пачынаўся як беларуска–нямецкае мерапрыемства. За дзевяць гадоў існаваньня ён ператварыўся ў сход беларускіх і замежных экспэртаў.

XI Менскі форум прайшоў 13—15 лістапада. Тэма Форуму была акрэсьленая як «Суседзтва і бясьпека: пэрспэктывы Беларусі ў Эўропе». Вядзе Форум ад пачатку нямецкі палітоляг Райнэр Лінднэр.

У працы ўзялі ўдзел 300 экспэртаў зь Беларусі, Германіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Фінляндыі, Швэцыі. Сёлетні Форум быў вылучаўся высокім прадстаўніцтвам як з боку ЭС, так і з боку беларускай улады.

На Форуме некалькі сэкцыяў: палітычная, эканамічная і прысвечаная пытаньням культуры, гісторыі і ідэнтычнасьці, а таксама СМІ і інфармацыйнай прасторы Беларусі.

Р.Лінднэр акцэнтаваў, што Форум — ня толькі сэкцыі, але і камунікацыя ў кулюарах.

Менскі форум — адно зь нешматлікіх месцаў, дзе могуць на роўных абмяняцца думкамі прадстаўнікі дзяржаўных структураў і грамадзянскай супольнасьці Беларусі.

### Кароткая размова Макея зь Мілінкевічам

Падчас Менскага форуму адбылася кароткая сустрэча кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Ўладзімера Макея зь лідэрам «Руху «За свабоду» Аляксандрам Мілінкевічам. Мілінкевіча прадставіў Макею пасол Нямеччыны Гебхардт Вайс. «У нас адбылася размова, — кажа А.Мілінкевіч. — Я выклаў пазыцыю сваю, якая ёсьць і пазыцыяй аб'яднаных дэмсілаў, пра тое, як мы ставімся да дыялёгу, што мы яго падтрымліваем. Я лічу, калі краіна ў небясьпецы, вельмі важна, каб эліты і контрэліты знайшлі супольную мову. Бо ў нас агульны інтарэс: захаваць Беларусь. А Беларусь сапраўды ў небясьпецы, бо мы можам стаць пратэктаратам суседняй краіны, найперш з прычынаў эканамічных. І патрэбны дыялёг ня толькі «Эўропа — улада». Патрэбны дыялёг «улада — дэмсілы».

Я думаю, што Ўладзімер Макей выдатна зразумеў тое, што я кажу. І, напэўна, ён таксама выступае за дыялёг. Але так вось зь першай размовы на вячэры такія справы не вырашаюцца. Я ўпэўнены, што ўлада таксама прыйдзе да неабходнасьці размовы з дэмсіламі, бо мы прадстаўляем найбольш актыўную, інфармаваную частку грамадзтва».

**Паводле радыё «Свабода»**

# Сідорскаму спадабалася

Мэтай I Беларускага інвэстыцыйнага форуму ў Лёндане было знаёмства прадстаўнікоў сусьветнага бізнэсу з інвэстыцыйнымі магчымасьцямі Беларусі, а нашых урадоўцаў — з сусьветным бізнэсам. На думку прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, «форум перасягнуў усе нашыя чаканьні».

16 лістапада ў лёнданскім аэрапорце «Гатвік» высадзіўся ўнушальны дэсант беларускіх удзельнікаў першага Беларускага інвэстыцыйнага форуму — у 4-зоркавым гатэлі Park Plaza County Hall для беларусаў забраніравалі 180 месцаў.

Зь беларускага боку працу форуму ўзначаліў прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі. Удзел у форуме ўзялі міністры эканомікі і сельскай гаспадаркі, намесьнікі міністраў прамысловасьці і энэргетыкі, кіраўнікі галіновых канцэрнаў, банкаў, заводаў. Зьвярнула ўвагу, што ў складзе дэлегацыі быў і дырэктар Гарадзенскага гарбарнага заводу, былы кандыдат у прэзыдэнты ад апазыцыі Сямён Домаш.

Замежных экспэртаў ды інвэстараў прадстаўлялі лорд Робэрт Скідэльскі, які акрамя ўсяго ўваходзіць у раду дырэктараў расейскай карпарацыі «Сыстэма», Супачай Панічпакдзі, генсакратар Канфэрэнцыі ААН па гандлі і разьвіцьці, Алeксандра Хара, намесьнік гендырэктара СГА, а таксама прадстаўнікі замежных банкаў і кампаніяў, што маюць свой бізнэс у Беларусі.

Уласна форум быў падзелены на шэраг тэматычных сэкцыяў: «Прамысловасьць, нафтахімічны комплекс і энэргетыка», «Разьвіцьцё фінансавых рынкаў і фінансавых інстытутаў», «Аграпрамысловы комплекс, харчовая і лёгкая прамысловасьць», «Рэгіёны, свабодныя эканамічныя зоны, малы і сярэдні бізнэс». Дарэчы, сярод выступоўцаў на апошняй сэкцыі прадстаўнікоў незалежных прадпрымальніцкіх арганізацыяў заўважана не было.

Беларусы прадставілі ўвазе замежных інвэстараў больш за 70 інвэстпраектаў, сярод якіх — стварэньне марскога гандлёвага флёту Беларусі, пабудова заводу па вытворчасьці аўтобусаў на базе МАЗу, стварэньне каскадаў ГЭС на Дзьвіне і Дняпры ды інш.

На выніковай прэс-канфэрэнцыі прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі заявіў, што «форум у Лёндане перасягнуў усе нашыя чаканьні». Чым насамрэч могуць пахваліцца арганізатары? Адным з самых пэрспэктыўных вынікаў можна назваць пратакол пра намеры паміж беларускім Мінэканомікі і польскай кампаніяй «Кульчык Холдынг» наконт пабудовы вугальнай электрастанцыі ў Беларусі. Праект ацэньваецца прыблізна ў $1 млрд. Гаворкі пра яго вядуцца гады чатыры, ды пакуль бяз выніку. Меркавалася, што гэта будзе станцыя на польскім вугалі. Толькі ж вытворчасьць яго ў Польшчы скарачалася, краіна сама маеператварыцца ў імпарцёра гэтага паліва.

Сярод іншага, С.Сідорскі меў перамовы з кіраўніцтвам амэрыканскай карпарацыі «Катэрпілар». Гаворка вялася пра магчымасьці супольнай вытворчасьці рухавікоў.

Паводле словаў віцэ-прэм'ера Андрэя Кабякова, заслуга ня раз крытыкаванага дзяржаўнага кантролю над эканомікай у тым, што сусьветны крызіс пакуль мала крануў Беларусь.

Віцэ-прэзыдэнт банку RBS (ABN Amro) Франк Кайлаарс назваў умовы працы ў Беларусі зручнымі, бо тут «працуюць высокакваліфікаваныя і зычлівыя людзі» ды дзейнічае «дакладна адладжаная арганізацыя правядзеньня ўгодаў». Банк ABN Amro вядомы найперш па двух буйных працэсах — атрыманьні Беларусьсю краінавага крэдытнага рэйтынгу і перадпрадажнай ацэнкай «Белтрансгазу».

Ніхто зь незалежных журналістаў зь Беларусі на форум ня езьдзіў. Грошы, вядома, любяць цішу, але гэта, бадай, ня той выпадак. Прысутнасьць карэспандэнтаў не зашкодзіла б.

«Як піяр-акцыя форум, магчыма, быў пасьпяховы», — мяркуе намесьніца рэдактара эканамічнага тыднёвіка «Белорусы и рынок» Ірына Крыловіч. Што да доўгатэрміновых вынікаў, то казаць нешта пакуль рана, мяркуе яна.

Аналітык Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту Дзьмітрый Крук лічыць, што ў любым выпадку Лёнданскі форум наўрад ці будзе мець імгненны вынік для Беларусі.

Варта адзначыць, што форум прыпаў на няўдалы час: фінансавы крызіс не ўтаймаваны, для Беларусі горшыя часы, магчыма, яшчэ наперадзе. Таму сам момант для прыватызацыі не найлепшы — цана прадпрыемстваў падае, попыт нізкі, свабодных грошай на рынку мала.

**Сямён Печанко**

## Таня Казыра можа вярнуцца ў Беларусь

Бабуля 16-гадовай барысаўчанкі Надзея Новік паведаміла, што ўнучка хоча вярнуцца.

«Яна мне пазваніла а 3-й ночы і гаварыла, што хоча вярнуцца, — расказала Н.Новік. — Яна вельмі сумуе. Кажа, што калі, напрыклад, ідзе ў краму, то ёй падаецца, што яна бачыць твары сяброў і знаёмых».

Н.Новік зазначыла, што сям'я Сапата, у якой жыве дзяўчына, прапанавала ёй «добра падумаць». Бабуля таксама абвергла інфармацыю пра тое, што прычынай вяртаньня дзяўчынкі зьяўляецца «нешчасьлівае каханьне».

5 жніўня Т.Казыра, якая знаходзілася ў ЗША на аздараўленьні па чарнобыльскай праграме, разам з групай беларускіх дзяцей павінная была вылецець з Сан-Францыска ў Менск, аднак да прызначага часу не прыбыла ў аэрапорт. Пазьней стала вядома, што дзяўчына падала ў іміграцыйную службу дакументы для прадаўжэньня гасьцявой візы і застаецца ў ЗША, каб дачакацца рашэньня ўладаў.

У верасьні пасольствы замежных краінаў пацьвердзілі інфармацыю пра прыпыненьне Менскам праграмаў аздараўленьня беларускіх дзяцей за мяжой.

**БелаПАН**

## СЬЦІСЛА

### «Беларусбанк» ізноў павялічыў стаўкі па крэдытах

Каб атрымаць самы папулярны крэдыт — на спажывецкія патрэбы тэрмінам да трох гадоў, — трэ будзе плаціць 19% у беларускіх рублях і 16% у валюце. Што да будаўніцтва, то тут трэба плаціць 20% гадавых «за фактычны час карыстаньне крэдытам».

### Міністар Шапіра знайшоў адэкватны адказ Расеі

Міністар сельскай гаспадаркі і харчаваньня Сямён Шапіра прапанаваў правесьці інспэкцыю расейскіх прадпрыемстваў, якія пастаўляюць сваю прадукцыю ў Беларусь і назваў свой намер «адэкватнымі захадамі» ў сувязі з ігнараваньнем беларускіх прадуктаў. Паводле Шапіры, харчаваньне ў Расею пастаўляюць 122 прадпрыемствы аграпраму. Расейцы маюць прэтэнзіі да 35 зь іх. Прычына — неадпаведнасьць якасьці малака і мяса расейскім стандартам. Але пакуль толькі 7 прадпрыемстваў ведаюць, што канкрэтна не падабаецца расейскім спажыўцам іхняй прадукцыі. Міністар цьвердзіць: гэтымі дзеяньнямі Масква найперш абараняе ўласнага вытворцу. Страціць расейскі рынак нявыгадна, сказаў ён. Палова ўсяго беларускага малака экспартуецца менавіта ўсходняму суседу.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Менскі аўтамабільны рынак напярэдадні крызісу.**

### Грошы пайшлі

На рахунак Міністэрства фінансаў у Нацбанку 18 лістапада паступіў першы транш стабілізацыйнага крэдыту ад Расейскай Фэдэрацыі ў памеры $1 млрд. Сродкі пералічаныя ў адпаведнасьці з заключаным паміж Беларусьсю і Расеяй дамовай, якую падпісалі міністар фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец і міністар фінансаў Расеі Аляксей Кудрын. Усяго паводле дамоўленасьці цягам 2008—2009 гг. Беларусь мае атрымаць $2 млрд. стабілізацыйнага крэдыту.

**СП; паводле радыё «Свабода», nbrb.by**

# Новая антыкарупцыйная палітыка

За карупцыйныя злачынствы з пасадаў зьнятыя намесьнік генпракурора **Мікалай Купрыянаў**, пракурор Менскай вобласьці **Міхаіл Сьнягір**, намесьнікі міністра ўнутраных справаў **Аляксандар Шчурко** і **Віктар Філістовіч**, а таксама шэраг высокіх чыноўнікаў МУС.

З карупцыяй у Беларусі будуць змагацца «жастачайшым вобразам», заявіў Лукашэнка на нарадзе «па пытаньнях эфэктыўнасьці ўжываных мераў па барацьбе з карупцыяй», якая праходзіла 13 лістапада.

Лукашэнка быў у сапраўдным гневе. «Абурае карупцыя, якая разрастаецца сярод тых, хто па доўгу службы павінен змагацца зь ёй. У хабарніцтве аказваюцца замяшанымі прадстаўнікі сілавых структур, якія закліканыя прадухіляць падобныя зьявы. Папярэджваю ўсіх: у Беларусі такога беспрадзелу ня будзе! Нават у фрагмэнтарным парадку. Па крайняй меры, пакуль я прэзыдэнт. Не пагляджу ні на пасады, ні на чыны», — сказаў ён.

Лукашэнка прывёў канкрэтныя факты карупцыі сярод высокіх чыноўнікаў пракуратуры. «Пракурорскі работнік за капейкі купляе ў камэрсанта цалкам камфартабэльную кватэру з падземным гаражом. Здаецца, што ўсё законна. Але хіба не насьцярожвае, што бізнэсовец прадаў кватэру таньней, чым яна каштуе рэальна і дзе пракурор узяў гэтыя грошы». Тут меўся на ўвазе пракурор Менскай вобласьці Міхаіл Сьнягір.

Са словаў Лукашэнкі, грамадзянін Сідаровіч, які пражываў у той кватэры, зьвяртаўся неаднаразова ў Цэнтральны суд Менску, але судзьдзі Алена Ільіна, Валеры Есьман, Тацяна Паўлючук займалі пазыцыю Сьнегіра. Сідаровіч восем разоў падаваў скаргі ў Генпракуратуру, але ўсе дакумэнты справы сьпісваліся намесьнікам генпракурора Купрыянавым. Лукашэнка кажа, што Сьнягір будаваў яшчэ адзін дом ля Цнянскага вадасховішча, які «выглядае больш унушальна за рэзыдэнцыю прэзыдэнта». «Адкуль грошы? Вы што, выдаеце іх з касы пракуратуры?» — пытаўся Лукашэнка. Самае цікавае, што справа з кватэрай Сьнегіра выплывала яшчэ летась, але чамусьці ход ёй далі толькі цяпер.

Вінаваціў Сьнегіра і ў тым, што да яго зьвярталіся сябры-прадпрымальнікі з просьбай прыбраць канкурэнта і адмяніць рашэньне Найвышэйшага гаспадарчага суду. Тады Сьнегір праявіў надзвычайную актыўнасьць. У Найвышэйшым гаспадарчым судзе справу вырашаць ня выйшла праз «прынцыповую пазыцыю» Сьмірнова (былы намесьнік старшыні Найвышэйшага гаспадарчага суду). Але тут на дапамогу зноў прыйшоў Купрыянаў.

«Нават калі ў вас узьнікне маленькая закаручка і сумневы, усё: кватэры, жыльлё, машыны павінныя быць вернутыя іхным уладальнікам», — сказаў Лукашэнка.

Генэральны пракурор Рыгор Васілевіч атрымаў заданьне вызваліць ад займаных пасад свайго намесьніка Мікалая Купрыянава і ўсё таго ж Міхаіла Сьнегіра. А таксама завесьці супраць абодвух крымінальныя справы. Указаньне ўжо выкананае.

У сваю чаргу старшыню Вярхоўнага суду Валянціну Сукалу было даручана зьняць з пасадаў судзьдзяў Ільіну, Есьмана і Паўлючук (усе яны былі заплямленыя палітычнымі працэсамі, дарэчы, як і Купрыянаў ды Сьнягір). Аднак, як стала вядома ў аўторак радыё «Свабода», усе яны яшчэ знаходзяцца на сваіх пасадах.

Ня меншыя перамены чакаюцца і ў Міністэрстве ўнутраных справаў. Цягам лістападу сваіх пасадаў пазбавяцца першы намесьнік міністра Аляксандар Шчурко і яшчэ адзін намесьнік Навумава Віктар Філістовіч.

Лукашэнка сказаў, што 10 высокіх чыноўнікаў МУС пайшлі на парушэньне заканадаўства, каб атрымаць зямельныя дзялкі для будаўніцтва катэджаў у Менскім раёне. «Ведаеце, колькі заплацілі за іх «вартаўнікі парадку»? Ад 10 да 25 тысяч беларускіх рублёў. Абнаглелі да такой ступені, што заплацілі аж 25 тысяч. Наогул лепш бы не плацілі», — казаў Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы назваў канкрэтныя прозьвішчы. Апроч Шчурка і Філістовіча гэта былыя намеснікі міністра Радзюкевіч, Глухоўскі, дырэктар дэпартамэнту фінансаў і тылу Мельнікаў, дырэктар дэпартамэнту па грамадзянстве і міграцыі Іванчыкава, былы дырэктар дэпартамэнту выкананьня пакараньняў Каўчур, былы дарадца міністра Карпейчык, доктар шпіталю МУС Бурко, супрацоўнік ГУУС Новік.

«Да чаго мы дойдзем, калі барацьбой з карупцыяй займаюцца людзі, якія самі парушаюць законы і нормы маралі?» — рытарычна пытаўся Лукашэнка.

Таксама было агучана, што ад 1 студзеня Лукашэнка будзе прымаць рашэньні пра зьмякчэньні пакараньня ў дачыненьні да асуджаных за карупцыйныя злачынствы супрацоўнікаў праваахоўчых органаў.

«Расьцягваньня дзяржаўнай уласнасьці і «прыхватызацыі» ў Беларусі ня будзе. Лібэралізуючы эканоміку, нельга яе аддаваць у рукі жулікаў і прахадзімцаў. Некаторыя дамарошчаныя апазыцыянэры пасьпяшаліся заявіць, што чакаецца намэнклятурная прыватызацыя. Маўляў, усе «ласыя кавалачкі» падзеленыя між чыноўнікамі. Супакойцеся, спадарства! Мы ніколі гэтага не дапусьцім».

Кажуць, што карупцыйную справаздачу Лукашэнку прадставілі кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Уладзімер Макей разам з старшынём КДБ Вадзімам Зайцавым. Напэўна, не без дапамогі старшыні камітэту дзяржкантролю Зянона Ломаця. Уплыў Макея ў атачэньні Лукашэнкі працягвае расьці.

**ЗП**

## А судзьдзі хто?

Ільіна асудзіла на два гады калёніі Клімава. Есьман пакараў двума гадамі «хіміі» барысаўскіх «зуброў» Казакова і Зубра. Адміністрацыйныя суды ў Тацяны Паўлючук праходзяць як па канвэеры. Піша **Зьміцер Панкавец**.

На нарадзе ў чацьвер Лукашэнка даручыў старшыню Вярхоўнага суду Валянціну Сукалу зьняць з пасадаў судзьдзяў Алену Ільіну, Валер'я Есьмана і Тацяну Паўлючук. Усе яны аказаліся датычнымі да карупцыйнага скандалу разам з пракурорам Менскай вобласьці Міхаілам Сьнегіром.

«Якую, вы думаеце, пазыцыю занялі судзьдзі Ільіна, Есьман, Паўлючук? Судзьдзя Ільіна ўзгадняла па тэлефоне (ня толькі апазыцыю праслухоўваюць, як бачым — Рэд.) зь Сьнегіром пасьлядоўнасьць сваіх дзеяньняў. А судзьдзі Есьман і Паўлючук прымалі рашэньне накласьці спагнаньне на зьёмшчыка кватэры Сідаровіча за нібыта самавольную перапляніроўку кватэры», — эмацыйна зазначаў Лукашэнка.

Варта зазначыць, што ўсе пералічаныя судзьдзі лічацца найбольш адыёзнымі сярод апазыцыі. Алена Ільіна асудзіла на два гады калёніі Андрэя Клімава, а Андрэю Кіму дала паўтара гады турмы. Валеры Есьман у свой час пакараў двума гадамі «хіміі» барысаўскіх «зуброў» Аляксандра Казакова і Зьміцра Зубра, ён дасуджваў за Ільіной фігурантаў «працэсу чатырнаццаці». Адміністрацыйныя суды ў Тацяны Паўлючук праходзяць як па канвеэры. Толькі сёлета яна пакарала рознымі тэрмінамі зьняволеньня некалькі дзясяткаў (ці ўсё ж больш за сотню?) моладзевых актывістаў. Трапіць на працэс да Паўлючук лічыцца найбольш непрымальным варыянтам.

А за што судзілі? За «вялікія» злачынствы — за палітычнае графіці, за дэманстрацыю пратэсту прадпрымальнікаў, за артыкул у інтэрнэце, за «нецэнзурную лаянку» (народнага мастака Аляксея Марачкіна) і «спраўленьне натуральнай патрэбы ў грамадзкім месцы». Ці ня сьмешна?

Усе гэтыя надуманыя абвінавачваньні судзьдзямі Ільіной, Паўлючук і Есьманам прымаліся за чыстую манэту. Напэўна, ім у галаву не магло прыйсьці вынесьці апраўдальныя прысуды. І разам з тым, гэтыя судзьдзі самі былі замяшаныя ў далёка ня самых чыстых справах. Як і пракуроры Купрыянаў, Сьнягір, якія таксама адзначыліся ў палітычных расправах.

Але самае абсурднае ў тым, што літаральна праз пару тыдняў судзьдзя Валеры Есьман (ніхто пакуль так і ня быў зьняты з пасадаў) можа пачаць разгляд крымінальнай справы Аляксандра Баразенкі. 13 лістапада стала крышачку больш зразумела, каго ставяць судзіць іншадумцаў.

## СЬЦІСЛА

### Аляксандар Баразенка абвясьціў галадоўку

Зьняволены Аляксандар Баразенка мае намер трымаць галадоўку, пакуль яго ня вызваляць. Чацьвера пакараных абмежаваньнем свабоды ў «Працэсе 14-ці» — Аляксей Бондар, Міхаіл Пашкевіч, Арцём Дубскі і Павал Вінаградаў — накіравалі старшыню Вярхоўнага суду Валянціну Сукалу і генэральнаму пракурору Рыгору Васілевічу ліст, у якім просяць перагледзець сваю судовую справу і вызваліць Баразенку. Хлопец ад 27 кастрычніка знаходзіцца ў СІЗА на Валадарскага. Ён праходзіць па крымінальнай справе за мітынг прадпрымальнікаў 10 студзеня. Судзіць Аляксандра будуць цягам месяцу ў Цэнтральным судзе Менску.

16 лістапада акцыі салідарнасьці з Аляксандрам прайшлі ў многіх гарадах Беларусі.

Выказаць сваю падтрымку палітвязьню можна, напісаўшы яму на адрас: 220050 Менск, Валадарскага, 2, к.182.

### Прадпрымальнікі рыхтуюцца да маршу

Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне «Пэрспэктыва» падало заяўку ў Менгарвыканкам на правядзеньне 15 сьнежня ў Менску маршу прадпрымальнікаў.

У заяўцы ад імя васьмі актывістаў гаворыцца, што мітынгам і шэсьцем удзельнікі акцыі хочуць «прыцягнуць увагу ўладаў да невыканальных ўмоваў, якія чакаюць індывідуальных прадпрымальнікаў ад 1 студзеня 2009 году».

Адносна таго, што мітынг плянуецца правесьці на плошчы Бангалёр, кіраўнік «Пэрспэктывы» Анатоль Шумчанка сказаў, што для арганізатараў «важна прадэманстраваць пазыцыю людзей і як мага большай колькасьці, і бяз мэты сутыкненьняў зь міліцыяй».

«Мы гатовыя змагацца. І людзі таксама настроеныя на барацьбу», — адзначыў А.Шумчанка.

### Жалезьнічэнка зьвярнуўся ў ААН

Былы студэнт, а цяпер салдат транспартных войскаў у Жлобіне накіраваў скаргу ў Камітэт ААН па правах чалавека. Ён аспрэчвае судовыя пакараньні штрафамі й арыштам нібыта за незаконнае прадпрымальніцтва, лаянку й непадпарадкаваньне міліцыі, а таксама паўторнае выключэньне з трэцяга курсу матэматычнага факультэту Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.

У войску з 22-тысячнага грашовага забесьпячэньня салдата Жалезьнічэнкі вылічваюць па 9 тысяч рублёў на пагашэньне двух зьдзеклівых штрафаў — за незаконнае прадпрымальніцтва й непадпарадкаваньне міліцыянту.

### Мядзьведзеў: Расея не павінная быць парлямэнцкай рэспублікай

«Для нас гэта сьмерць», — упэўнены кіраўнік Расеі. Кажучы пра меркаваныя зьмены ў Канстытуцыі, якія, у прыватнасьці, прымушаюць урад рабіць справаздачу перад парлямэнтам, Дзьмітры Мядзьведзеў падкрэсьліў, што гэта не ператварае Расею ў парлямэнцкую краіну.

**ЗП, Радыё Свабода**



Пікет у абарону башкірскай мовы. Уфа.

# Нябесныя ваўкі пачынаюць змаганьне

Пра новы ўздым незалежніцкіх рухаў у Паволжы піша **Сяргей Богдан**.

Фінансавы крызіс стаў нагодай для нечаканай крытыкі расейскімі рэгіёнамі фэдэральнага цэнтру, а таксама прапановаў вярнуцца да ідэі стварэньня ў Расеі сапраўднай фэдэрацыі. На фінансавы крызіс накладаецца фатальнае для Расеі значнае зьніжэньне цэнаў на нафту. Фатальнае, бо менавіта прыбыткі ад экспарту нафты і газу складаюць асноўную частку даходаў расейскага бюджэту, як некалі савецкага. Ягор Гайдар назваў кропкай пачатку распаду СССР 13 верасьня 1985 году, калі на сусьветных рынках пачалі падаць цэны на нафту. Таму і сёньняшняе патаньненьне нафты ня пройдзе незаўважна для Расеі. Адным з наступстваў можа стаць аслабленьне цэнтральнай улады і чарговы рывок залежных ад Расеі нацыяў да самастойнасьці.

### Татарстан і Башкартастан патрабуюць правоў

Прэзыдэнт Татарстану Мінтымэр Шаймііеў у сваім пазачарговым пасланьні да Дзяржрады на мінулым тыдні прызнаў, што крызіс зачапіў татарскую эканоміку, і вінаватыя ў тым расейскія дзяржаўныя банкі ды іх палітыка. Спаслаўшыся на словы Дзьмітрыя Мядзьведзева, што «расейскі фэдэралізм мае патрэбу ў далейшым разьвіцьці» і «аптымальны баланс разьмежаваньня паўнамоцтваў паміж фэдэрацыяй і рэгіёнамі» яшчэ не дасягнуты, Шаймііеў заявіў, што прыняты летась абноўлены варыянт дамовы пра разьмежаваньне паўнамоцтваў паміж Масквой і Казаньню «пакуль не напоўнены рэальным зьместам».

Падтрымлівае суседа прэзыдэнт Башкартастану Муртаза Рахімаў, які пры канцы кастрычніка ў сваім пасланьні ўдзельнікам канфэрэнцыі «Фэдэралізм як рэсурс разьвіцця расейскай дзяржаўнасьці XXI стагодзьдзя» зазначыў, што «годным адказам на выклік фінансавага крызісу маглі б стаць аднаўленьне раней дэмантаваных элемэнтаў фэдэралізму, ліквідацыя дысбалянсу паміж цэнтрам і суб’ектамі Фэдэрацыі».

На думку Рахімава, у пачатку 1990-х гадоў ва ўмовах распаду СССР якраз ідэі фэдэралізму выратавалі расейскае адзінства. «Тады фэдэралізм стаў гарантам тэрытарыяльнай цэласьці краіны, яе разьвіцьця на прынцыпах дэмакратыі, рынку і самастойнасьці».

«За апошнія васямнаццаць гадоў Башкартастан пераканаўча давёў, што, валодаючы рэальнымі правамі і магчымасьцямі, можна дасягнуць многага. Перакананы, што патэнцыял фэдэралізму далёка ня вычарпаны, і яго наступнае ўдасканаленьне — гэта стратэгічны рэсурс вялікай Расеі».

Рахімаў мае на ўвазе прыняцьце 18 гадоў таму, 11 кастрычніка 1990 году, Дэкларацыі пра дзяржаўны сувэрэнітэт Рэспублікі Башкартастан, паводле якой усе багацьці Башкірыі належаць народу краю, а з Расеяй усталёўваюцца дамоўныя адносіны. У 2007 годзе фэдэральны цэнтар адмовіўся працягнуць дамову пра разьмежаваньне паўнамоцтваў з Башкірыяй.

### Рахімаў рыхтуе башкірскіх нацыяналістаў

Расейскі друк прыпісвае Рахімаву спробу ціснуць на фэдэральны цэнтар праз радыкальныя нацыяналістычныя арганізацыі — БНЦ «Урал», СБМ (Саюз башкірскай моладзі), але цяпер перш за ўсё праз «Кук бурэ» («Нябесны воўк» — http://kykbyre.ru). Невялікая пакуль арганізацыя «Нябесных ваўкоў» складаецца перадусім з спартоўцаў, але сярод яе гучных сёлетніх ініцыятываў была кампанія супраць зносу археалягічнага помніка і за абавязковае выкладаньне башкірскай мовы ў школах.

Пасьля грузінскіх падзеяў лідэры арганізацыі Азат Сальманаў і Цімур Мухтараў выступілі з заявай, у якой абвінавацілі Крэмль у падвойных стандартах, маўляў, Масква падтрымлівае асэтынаў і абхазаў, але ігнаруе башкірскі народ дый паводзіць сябе як «імпэрыяліст-калянізатар у дачыненьнях з карэнным насельніцтвам». Раней з падобнай заявай пра тое, што і Татарстан мае ня меншыя правы на свабоду, чым Абхазія ці Асэтыя, выступіў Татарскі грамадзкі цэнтар — галоўны легальны асяродак татарскіх нацыяналістаў.

Азат Сальманаў выказваецца яшчэ больш рашуча: «Час спыніць Маскву, якая прывыкла думаць і вырашаць, што рабіць башкірам. Сёньня башкірам не даюць захаваць сваю мову — заўтра не дадуць захаваць Рэспубліку ды скасуюць наш народ наагул. Такая імпэрская палітыка ідзе ад часоў уваходжаньня башкіраў у Расею і працягваецца да сёньня. Будзе правільна назваць сёньняшнюю Расею Расейскай імпэрыяй, дзе няма ўмоваў для разьвіцьця карэнных народаў».

Зрэшты, другі сузаснавальнік руху, 31-гадовы праўнік Цімур Мухтараў, адмаўляе, што ў задачы «ваўкоў» уваходзіць атрыманьне незалежнасьці. Нехта можа абмяркоўваць такую магчымасьць прыватным чынам, але праз законы па барацьбе з экстрэмізмам небясьпечна цяпер казаць такое ў адкрытую.

На старонках «Независимой газеты» старшыня кардынацыйнай рады Аб’яднанай апазыцыі Башкірыі Раміль Бігнаў сьцьвярджае, што за «рухам «Кук бурэ» стаяць людзі з клану прэзыдэнта Рахімава, і актывізацыя гэтага руху зьвязаная з хісткім становішчам кіраўніка рэспублікі, якому пагражае хуткі сыход з палітычнай сцэны. Рахімаў спрабуе прыстрашыць Маскву выбухам незалежніцкіх настрояў у Башкірыі і прадставіць сябе адзінай сілай, здольнай гэты выбух стрымаць».

«Практычна за любой нацыяналістычнай арганізацыяй у Башкірыі стаяць людзі, блізкія да прэзыдэнта Рахімава, — мяркуе таксама аналітык татара-башкірскай рэдакцыі радыё «Свабода» Карым Якушаў. — Больш за тое: гэтыя арганізацыі створаны ўладай, іх задача — зьяўляцца ў патрэбны час у патрэбным месцы і выкрыкваць патрэбныя лёзунгі супраць фэдэральных уладаў у падтрымку прэзыдэнта Рахімава. Уладам рэспублікі патрэбныя такія радыкальна наладжаныя людзі, якія зьяўляюцца як чорт з табакеркі, каб у выпадку неабходнасьці паказваць іх фэдэральным уладам. Маўляў, у нас ёсьць радыкалы і толькі мы можам іх стрымаць».

### Як татары страцілі сваю свабоду

У 1990-я Барыс Ельцын прапанаваў рэгіянальным лідэрам «узяць столькі сувэрэнітэту, колькі дадуць рады». Рухі за самакіраваньне разгарнуліся ў шэрагу важных рэгіёнаў: у Татарстане зь яго нафтавай, аўтамабільнай і авіяцыйнай прамысловасьцямі; у Башкартастане, які валодае сур’ёзнымі пакладамі прыроднага газу; у Комі, паўночнай рэспубліцы, багатай вугалем.

Татарстан і Башкартастан дамагліся ад фэдэральнага Цэнтру найбольшых правоў і паўнамоцтваў, якія амальператваралі іх у дзьве паўнавартасныя дзяржавы. Абедзьве рэспублікі атрымалі і немалыя фінансавыя ўліваньні з фэдэральнага бюджэту — для іх былі распрацаваныя і рэалізоўваліся адмысловыя фэдэральныя мэтавыя праграмы.

Цікава, што Татарстан ёсьць прыкладам настойлівага імкненьня да незалежнасьці мірным шляхам, гэтаксама як Чачэнія ёсьць узорам узброенага змаганьня. Татары і сёньня адзначаюць дзень канца сваёй дзяржавы, калі ў 1552 годзе Казань пала перад войскам Івана Жахлівага — з гэтай даты пачынаецца гісторыя Расейскай Імпэрыі.

Калі Ельцын прапанаваў сувэрэнітэт, татары рашуча ўзяліся за працу, зацьвярджаючы свае падаткі і ўводзячы свае аўтамабільныя нумары. Зіхоткія мінарэты ўсё новых і новых мячэтаў пачалі канкураваць з цыбулінамі праваслаўных цэркваў, а ў татарскага насельніцтва зьявіліся свае, татарскія школы. Татарскі парлямэнт пастанавіў, што мясцовыя прызыўнікі не павінны ўдзельнічаць у ваенных дзеяньнях за межамі Паволжа.

Гэта быў час вольнасьці. Барыс Ельцын заключыў дамовы аб разьмежаваньні паўнамоцтваў фэдэральнага ўраду з 46 рэгіёнамі РФ. Пасьля абраньня на пост прэзыдэнта Пуціна такая практыка была спыненая. Зь сьнежня 2001 году да красавіка 2002 году 28 дамоваў з рэгіёнамі былі ануляваныя. У 2003 годзе папраўкі ў закон «Пра агульныя прынцыпы арганізацыі заканадаўчых і выканаўчых органаў дзяржаўнай улады суб’ектаў РФ» спынілі дзеяньне ўсіх раней заключаных дамоваў.

Калі Пуцін скасаваў выбары рэгіянальных кіраўнікоў, татарскі прэзыдэнт гучна пратэставаў, называючы рашэньне «гвалтоўным і балючым». Але ў наступныя гады, зазначае на старонках «Нью-Ёрк Таймз» рэдактар аднае з казанскіх апазыцыйных газэтаў Рынат Ахмэтаў, татарская аўтаномія яшчэ больш




**Рэспубліка Башкартастан**

месьціцца на схілах паўдзённага Ўралу. Плошча: 142,9 тыс кв. км. Сталіца — Уфа.

Насельніцтва 4063,4 тыс. чалавек (2006). Расейцаў — 36%, башкіраў — 30%, татараў — 24%. Ёсьць беларусы (0,4%).

Карысныя выкапні: нафта, прыродны газ, вугаль, жалезная руда, цынк, золата.

Найважнейшыя галіны прамысловасьці — нафтаздабыча і нафтаперапрацоўка, мэталаапрацоўка.

звузілася.

«Мы зразумелі, што нашага прэзыдэнта могуць прыбраць у любы момант, на працягу 24 гадзінаў». У той самы час рашэньне Крамля прызнаць Паўднёвую Асэтыю і Абхазію, кажа Рынат Ахмэтаў, «стварыла прэцэдэнт» набыцьця незалежнасьці. Масква ўпэўненая ў сваім жорсткім палітычным кантролі ў аддаленых рэгіёнах, але гэта можа зьмяніцца, бо «мэханізм самаразбурэньня ўбудаваны ў аўтарытарную сыстэму».

Зрэшты, летась кіраўніцтва Татарстану дамаглося для сябе прывілею — паміж рэспублікай і фэдэральным цэнтрам была складзеная новая дамова на размежаваньне паўнамоцтваў. Такім чынам рэспубліка стала адзіным рэгіёнам, у якога пасьля скасаваньня дамоўных адносінаў з цэнтрам атрымалася прыняць абноўлены варыянт такой дамовы. І хоць дакумэнт 2007 году, у адрозьненьне ад папярэдняй дамовы 1994 году, страціў практычна ўсе згадкі пра сувэрэнітэт рэспублікі, ён захаваў адмысловы статус Татарстану. Прэзыдэнту Башкірыі ў такім прывілеі было адмоўлена.

Пры ўсім пры тым заўважым, што кіраўнікі Татарстану і Башкартастану зусім не падобныя на незалежнікаў кшталту Джахара Дудаева і не выглядаюць на нацыянальных лідэраў, бо належаць да кагорты позьнесавецкіх кіраўнікоў, вядомай беларусам па постацях Кебіча і Малафеева. Праўда, часы мяняюцца, і вось ужо за тым жа Рахімавым праглядаецца больш дынамічная постаць магчымага будучага башкірскага лідэра — прэм'ера Раіля Сарбаева, які паходзіць з самага нацыяналістычнага рэгіёну Башкартастану — Заўральля і вызначыўся падтрымкай нацыяналістычных пачынаньняў.

### Башкіры і татары: падзяляй і пануй

Аднак на шляху абодвух павольскіх народаў — татараў і башкіраў — да свабоды можа паўстаць старая праблема — іх узаемныя крыўды. У тэрытарыяльна большым Башкартастане (роўным па плошчы Беларусі без Гарадзенскай і Берасьцейскай вобласьцяў) жыве і больш людзей (4 100 тысячаў чалавек), чымся ва ўдвая меншым па тэрыторыі Татарстане, дзе жыве толькі каля 3 800 тысячаў чалавек. Аднак татары зьяўляюцца дамінантным этнасам Паволжа, і башкіры маюць да іх шмат крыўдаў, як да такіх сабе міні-імпэрыялістаў. Балазе татары гістарычна былі больш актыўныя ў праявах сваіх інтарэсаў і адстойваньні сваіх правоў.

Сытуацыя башкіра-татарскага ўзаемадзеяньня зьбольшага нагадвае адносіны паміж беларусамі і палякамі, прытым на месцы беларусаў знаходзяцца башкіры, а на месцы палякаў — татары. Татара-башкірскія ўзаеміны абвастраныя праз нацыянальнага складу гэтых рэспублікаў, бо ў Башкартастане найбольшай нацыянальнай групай сталі расейцы (36,3%), а колькасьць башкіраў (29,3%) ненашмат перавышае колькасьць татараў (24,1%). Такія суадносіны дазваляюць трымаць тытульную нацыю ў вельмі няпэўным стане што да развіцьця ўласнай дзяржаўнасьці.

Сытуацыя ў Татарстане больш адназначная, там татары складаюць 52%, а расейцы — толькі 39,5%. Але значныя групы татараў жывуць на тэрыторыі ўсіх суседніх адміністрацыйных адзінак Расеі, таму разьвіцьцё татарскай нацыі тармозіцца адміністрацыйнымі перашкодамі, а адносіны з суседзямі ўскладняюцца праз неабходнасьць для Казані пастаянна бараніць правы суродзічаў за межамі Татарстану.

Дагэтуль татары і башкіры падазрона ставіліся адно да аднаго, але разам з тым існуе даўняя ідэя аб'яднаньня татараў, башкіраў, чувашоў ды іншых меншых нацыяў Волгі і Ўралу ў рамках адзінай Ідэль-Уральскай Рэспублікі, якая сапраўды магла б быць жыцьцяздольнай незалежнай дзяржавай. Рэспубліка была абвешчаная 1 сакавіка 1917 г. Мусульманскім вайсковым зьездам у Казані і задушаная бальшавікамі ў 1920-я. Але менавіта такога кшталту праекты — супраца меншых нацыяў — могуць стаць новымі пасьпяховамі варыянтамі разьвіцьця нацыянальнага руху народаў Расейскай Фэдэрацыі. Прэцэдэнты ёсьць — ідэя Імірату Каўказ, пазычаная сёньняшнімі каўкаскімі партызанамі ў Імама Шаміля і абвешчаная летась, ёсьць ужо зусім рэальнай палітычнай канструкцыяй, што прыйшла на зьмену вузейшым нацыянальным праектам.

Вядома, рана казаць пра непазьбежнасьць распаду Расеі, але трэба прызнаць немагчымасьць працяглага захаваньня гэтай краіны ў сёньняшняй форме. Ня кажучы ўжо пра нейкія рэгіянальныя крыўды на сквапны Крэмль, сама цяперашняя сытуацыя народу Расейскай Фэдэрацыі і росквіт у краіне ксэнафобіі ды адкрытага фашызму адштурхоўвае ад расейскай дзяржавы і прымушае згуртоўвацца ўсіх нерасейцаў — то бок палову жыхароў краіны.

Расісцкія выпады ўжо даўно маюць выгляд ня толькі Руху супраць нелегальнай міграцыі ці «Русского марша», але і зусім канкрэтнай разьні «іншародцаў». Паводле дадзеных МУС РФ, «за пэрыяд з студзеня да 15 кастрычніка 2008 г. было зафіксавана прынамсі 250 нападаў на глебе ксэнафобіі, вынікам якіх сталі 112 загінулых і прынамсі 337 пацярпелых». Маштабы праблемы гавораць пра абыякавасьць расейскіх уладаў да сытуацыі, калі не пра спрыяньне чарнасоценным настроям у мэтах кантролю «нярускага» насельніцтва.

Гэта страшныя лічбы для шматнацыянальнай краіны, сьмяротны дыягназ ёй. Дадайце сюды пашырэньне ў апошнія гады партызанскага руху супраціву з Чачэніі на Дагестан, Інгушэцію ды Заходні Каўказ, і зробіцца ясна, што Расея сапраўды сутыкнулася з сур'ёзным выклікам самому яе існаваньню. Дагэтуль Масква сяк-так трымала краіну разам дзякуючы росту цэнаў на вуглевадароды і адпаведным прыбыткам. Але сёньня гэтая крыніца грошай пачынае высыхаць, а іншай у нашых усходніх суседзяў няма.

# Кіраўніком нямецкіх «Зялёных» стаў немец турэцкага паходжаньня

Старшынём адной з асноўных нямецкіх партыяў — «Зялёных» — быў абраны немец турэцкага паходжаньня Джэм Оздэмір.

Яму 42 гады, а ў Нямеччыну былі прыехаўшы яшчэ ягоныя бацькі ў 1960-х. Жывучы ў зацята каталіцкім рэгіёне Швабіі, Джэму ў дзяцінстве яшчэ давялося сутыкнуцца з дыскрымінацыяй. Да зялёных ён далучыўся ў 15 гадоў, прынесшы ім экалягічныя пляны, якія сам распрацаваў для роднага мястэчка.

Джэм Оздэмір паводле адукацыі пэдагог і вольна размаўляе на абедзьвюх родных мовах — турэцкай і нямецкай. Ён стаў першым туркам, абраным у нямецкі парлямэнт у 1994 годзе. Пасьля далейшага навучаньня ў ЗША і шлюбу з аргентынскай журналісткай Оздэмір быў у 2004 годзе абраны ў Эўрапейскі парлямэнт, дзе стаў экспэртам сваёй партыйнай фракцыі па замежнай палітыцы.

Оздэмір не займаўся беларускімі пытаньнямі, хоць і сустракаўся часам зь беларускімі наведнікамі ў Брусэлі, але прынцыпова ставіцца да пытаньняў дэмакратыі і правоў чалавека.

У прыватнасьці, ён выступіў супраць заключэньня ЭС гандлёвага пагадненьня з Туркмэністанам, зазначыўшы, што той не свабаднейшы за Беларусь.

«Цалкам недарэчна для Эўрапарлямэнту падтрымліваць прапанову пра разьвіцьцё стасункаў з Туркмэністанам і ў той самы час заклікаць да павелічэньня ціску і новых санкцыяў супраць Беларусі. Гэта толькі яшчэ больш падарве міжнародны аўтарытэт ЭС. Наяўнасьць значных радовішчаў газу грае асноўную ролю ў кшталтаваньні палітыкі ЭС у дачыненьні да Туркмэністану. Гэта дазваляе патлумачыць розьніцу ў падыходах да Беларусі і Туркмэністану».

**Сяргей Богдан**

## З УСІХ СТАРОН

### Крызіс ня цётка: мэню працоўнага абеду кіраўнікоў 20-ці найбольшых краінаў сьвету

У Вашынгтоне прайшоў саміт дваццаці найбольшых краінаў сьвету. Мэтай сустрэчы было распрацаваць плян змаганьня зь фінансавым крызісам. Краіны «Вялікай дваццаткі» выпрацоўваюць каля 85% ВУП сьвету. З нагоды прыезду лідэраў у Белым доме адбыўся працоўны абед ад імя прэзыдэнта ЗША. Частавалі вэнджаную на садовай драўніне перапёлку, запечаную з чабарам ягняціну на скабках і фандзю з таматамі, кропам ды баклажанамі пад грыбною падлівай. Да страваў Буш падаваў чырвонае віно Shafer Cabernet Hillside Select 2003 году. Дарэчы, у інтэрнэткраме яно каштуе 499 даляраў за пляшку.

От жа, сябры, да сапраўднага крызісу сьвету яшчэ далёка.

### Крэдыт — пакуль толькі Ісьляндыі

Найбліжэйшым часам Ісьляндыя можа атрымаць ад Міжнароднага валютнага фонду займ у 2 мільярды даляраў. Кіраўнік МВФ Дамінік Строс-Кан абвясьціў, што краіны — чальцы арганізацыі дасягнулі пагадненьня на гэты конт.

Ісьляндыя стала першай краінай, банкаўская сыстэма якой абрынулася ў адначасьсе ў выніку фінансавага і крэдытнага крызісу.

У выніку ўрад краіны быў вымушаны нацыяналізаваць найбуйнейшыя банкі, каб не дапусьціць краху ўсёй нацыянальнай эканомікі.

### У Польшчы ўручаны пашпарт найстарэйшаму беларускаму грамадзяніну

Уручаны пашпарт найстарэйшаму беларускаму грамадзяніну, які жыве ў Польшчы. Паводле зьвестак пасольства Беларусі ў Варшаве, цырымонія з удзелам консульскага работніка і 105-гадовай Браніславы Гайжэўскай прайшла 12 лістапада. Б.Гайжэўская нарадзілася 20 чэрвеня 1903 г. на Гарадзеншчыне. Да 1979 году працавала ў калгасе, а потым выехала ў Польшчу па запрашэньні сына.

Браніслава Іванаўна мае трох дзяцей, дзевяць унукаў, 15 праўнукаў і пяць прапраўнукаў.

### Расейская Дзяржduma прагаласавала за папраўкі да Канстытуцыі

Расейскі парлямэнт у першым чытаньні ўхваліў папраўкі ў Канстытуцыю, што павялічваюць тэрмін паўнамоцтваў прэзыдэнта і Дзярждумы з чатырох да шасьці й пяці гадоў адпаведна.

«За» прагаласавала 388, «супраць» — 58 дэпутатаў з 450-ці. Папраўкі падтрымалі ўсе парлямэнцкія фракцыі, апроч Камуністычнай партыі РФ, куды ўваходзіць 57 дэпутатаў.

Канстытуцыя Расеі не мянялася з моманту яе прыняцьця 12 сьнежня 1993 году. Унесьці папраўкі прапанаваў прэзыдэнт Дзьмітрый Мядзьведзеў у сваім пасланьні Фэдэральнаму сходу 5 лістапада.

### МЗС Украіны абураны дзеяньнямі пасла Расеі

Нэгатыўную рэакцыю замежнапалітычнага ведамства выклікаў намер Віктара Чарнамырдзіна і шэрагу супрацоўнікаў расейскага пасольства ўзяць удзел у арганізацыі паказу скандальнага фільма пра сёлетнія падзеі ў Грузіі.

Міністэрства замежных справаў Украіны выказала абурэньне з нагоды дзеяньняў пасла Расеі Віктара Чарнамырдзіна, зьвязаных з дэманстрацыяй у Кіеве фільму «Вайна 08.08.08. Мастацтва здрады». МЗС выказала рашучы пратэст, назваўшы дзеяньні расейскага пасольства «непрыхаванай антыўкраінскай правакацыйнай акцыяй». Паказ скандальнай стужкі, якую ўкраінскае замежнапалітычнае ведамства лічыць сфабрыкаванай не без удзелу расейскіх спэцслужбаў, арганізавала пасольства Расеі і дэпутат Вярхоўнай Рады ад Партыі рэгіёнаў Валер Канавалюк, які ўзначаліў часовую сьледчую парлямэнцкую камісію па расьсьледаваньні абставінаў продажу ўкраінскай зброі ў Грузіі. У забароненым да паказу ў Кіеве фільме гучалі абвінавачаньні ў «незаконных пастаўках» Украінай зброі ў Грузію.

**Паводле Бі-Бі-Сі, БелаПАН, МБ, НБ, Korrespondent.net, euronews.net**

# Мужчынская палата

*«Пекла — гэта іншыя»*
***Ж.-П.Сартр***

*«Іншыя — гэта рай»*
***Сястра Эманюэль, якая памерла сёлета ў Парыжы ва ўзросьце 99 гадоў***

**Працяг са старонкі 2.**

Раніцай па панядзелках, калі сюды прыбывае чарговая партыя пацыентак і яны выстройваюцца ў вузкім паўцёмным калідоры — старыя і маладыя, прыгожыя і непрыгожыя, заплаканыя і з выгляду спакойныя, у шыкоўных хатніх халатах ці нейкіх абносках, а мэдсёстры ў белым на іх пакрыкваюць, каб хутчэй варушыліся, — карціна чымсьці нагадвае этап. Не, гэта не турма і не канцлягер. Адсюль можна выйсьці на волю як толькі захочаш. Але часам падаецца, што ўваходу ў гэтае аддзяленьне пасаваў бы надпіс: «Пакінь надзею кожны, хто сюды ўваходзіць» (вольны пераклад з Дантэ).

Цяжка глядзець у вочы жанчынам, якія толькі кладуцца ў аддзяленьне, поўныя жаху і адчаю.

Але яшчэ цяжэй бачыць абыякавасьць і нудоцьце ў вачах некаторых наведнікаў, што прыходзяць сюды да сваіх крэўных ці сваякоў. Наведнікам так хочацца хутчэй пакінуць гэтае абіталішча пакутаў, апынуцца зноў у Горадзе Сонца, уліцца ў бясконцы паток аўтамабіляў, якія весела блішчаць фарамі, альбо ў шэрагі мінакоў, занятых сваімі справамі.

### Шэсьць

У гэтым моры жанчынаў ёсьць выспа, на якой жывуць мужчыны. Палата на шэсьць ложкаў нібы адмыслова створаная, каб праводзіць сацыялягічныя дасьледаваньні. Вось фокусгрупа.

Тры пэнсіянэры (найстарэйшаму 90 гадоў), два рабочыя (малодшаму 20) і адзін журналіст.

Найстарэйшы пэнсіянэр — адзіны ў палаце расеец. Нарадзіўся ў Ніжагародзкай губэрні, ваяваў у Беларусі ў 1941-м, быў паранены, трапіў у нямецкі палон, потым у партызаны. Ажаніўся зь беларускай, мае дзяцей і ўнукаў. Адразу пасьля вайны пабудаваў у Менску драўляны дом, у якім жыве дагэтуль. Вельмі злуе на дзяржаву, што тая ня хоча аплочваць хоць бы частку ягоных камунальных выдаткаў. А ён жа ж інвалід Вялікай Айчыннай, кроў ліў…

Другі пэнсіянэр з 12 гадоў рабіў у калгасе на трактары. Марыў стаць інжынэрам, але не хапіла адукацыі — скончыў усяго некалькі клясаў. Сам навучыўся разьбірацца ў маторах, і ўсё жыцьцё рамантаваў розную тэхніку, у тым ліку легкавыя аўтамашыны. За гэта ў 1970-я гады сусед па вёсцы накатаў на яго цялегу ў органы — маўляў, той таемна рамантуе й зьбірае машыны ў сваім гаражы. Амаль што беларускі Генры Форд. У міліцыі, дзякуй Богу, толькі пасьмяяліся з таго даносу. На пэнсіі чалавек заняўся пчалярствам, мае немалую пасеку пад Менскам. Ведае пра пчолаў амаль што ўсё і фанатычна іх любіць. Асабліва яго захапляе наступная карціна: летнім днём, калі матка новага рою ўжо ў вульлі, пчолы, нібы гіганцкая эскадрыльля, у строгім парадку залятаюць у яго. Апавёў народную прыкмету: калі ўвосень ці ўзімку гаспадар пасекі памірае, трэба пайсьці і пагрукаць па ўсіх вульлях, інакш пчолы ніколі больш не абудзяцца. Аматар жаночага полу. У аддзяленьні кабеты рознага ўзросту ўвесь час завіхаліся вакол яго. Некаторых ён частаваў пяргой — мёдам з цалкам. Любіць сваю старэнькую жонку, увесь час сумаваў безь яе.

Наймалодшы з пэнсіянэраў (75 гадоў) працаваў некалі інжынэрам-канструктарам на заводзе ЭВМ, потым быў робататэхнікам. Інтэлігентны, адукаваны, зьедлівы й дасьціпны. У нядаўнія гады працаваў у аб’яднаньні «Квант», якое супрацоўнічала з БДУ пры Казуліне і якое абвінавацілі ў крадзяжы ў дзяржавы 30 кілаграмаў золата. Цягам сьледзтва, пра якое з гумарам апавёў былы інжынэр, ня выявілі зьнікненьня аніводнага мікраграму.

Рабочы-мэтрабудавец пачынаў працоўную біяграфію вэтэрынарам — у вёсцы, дзе нарадзіўся. Можа гадзінамі апавядаць пра розныя выпадкі з вэтэрынарнага жыцьця, сумныя і вясёлыя. (Сумныя — бо вэтэрынар ня толькі лекуе жывёлаў, але пры неабходнасьці забівае іх. І тут важна, як ён кажа, самому ня быць быдлам). Апавёў пра барана, які ўначы пачаў раптам біцца галавой у сьцены хлява, ледзь не разьнёс яго ўшчэнт. Выявілася, што ўдзень блізу таго месца, дзе баран пасьвіўся, працавалі зваршчыкі. Яму было цікава глядзець, як зіхаціць электразварка, а потым вочы запаліліся, і баран пачаў ад болю кідацца на сьцены. У Менску вэтэрынару прапанавалі добрую працу ў лябараторыі, па спэцыяльнасьці, абяцалі кватэру. Пасьлалі дакумэнты на зацьверджаньне начальству ў Маскву (тады гэта было абавязкова). Адказу так і не дачакаўся. А тут пачалося будаўніцтва сталічнага мэтрапалітэну. Там таксама абяцалі хутка даць кватэру. Кватэру далі толькі праз гадоў пятнаццаць, але майстрам працаваць на будаўніцтве мэтро ён так і застаўся.

Пра малодшага — рабочага з маторнага заводу — амаль няма чаго сказаць. Акрамя таго, што сьвядомасьць ягоная ўяўляе сабой чысты ліст паперы. Усе веды абмяжоўваюцца кампутарнымі гульнямі ды мабільнымі тэлефонамі. Нічога ў жыцьці не чытаў, ніколі нават ня чуў, напрыклад, пра Рабінзона Круза ці Гулівэра. Але вельмі цікавіцца ўсім. Пасьля таго, як пачуў у сталоўцы «смачна есьці!», адразу паспрабаваў перайсьці на беларускую мову.

### Хімія і жыцьцё

Істотны недахоп сацыялягічных дасьледаваньняў у шпіталі — плыннасьць кантынгенту. Адны пацыенты сыходзяць, іншыя прыходзяць на іхнае месца. Так, у адной палаце апынуліся ажно тры журналісты. Яўны перабор, тым больш што двое зь іх мелі дачыненьне да органаў унутраных справаў. Адзін працаваў некалі ў газэце «На страже Октября», а другі здымаў на відэакамэру розныя мерапрыемствы, у тым ліку апазыцыйныя…

Зьявіўся і прадстаўнік Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта — сантэхнік.

Аднойчы ў палату прывялі хлопца гадоў 25, які выглядаў значна старэйшым за свой узрост, бо меў цэлы букет хвbabaў. — Ты адкуль? — спыталіся ў яго. — Я з хіміі, — адказаў хлопец весела. — Ты што, прайшоў ужо недзе хіміятэрапію? — Ды не, — засьмяяўся ён — я адбываю пакараньне на «хіміі». Два гады абмежаваньня волі за рабаваньне.

Маладому «зэку» спачатку вельмі спадабалася ў шпіталі. Можна паспаць, нават удзень! Можна нармальна паесьці (пасьля турэмнай пайкі бальнічная ежа падаецца ня горшай за рэстаранную), паразмаўляць з нармальнымі людзьмі. На цябе ня толькі не крычаць, але дбаюць пра тваё здароўе. Вакол шмат дзяўчатаў, сярод якіх ёсьць вельмі прыгожыя. Празь некалькі дзён зэк пачаў гаварыць ужо ня толькі матам, але й нармальнай мовай. Ахвотна адгукаўся на жарты і сам жартаваў. Падчас тэлерэпартажу ў навінах АНТ з вайсковых вучэньняў, на якіх вярхоўны камандуючы зьявіўся разам з маленькім Міколкам, апранутым у афіцэрскую форму, адна з пажылых пацыентак запыталася: «А вам не падаецца, што наш галоўны падобны да…» І асяклася. Зэк, які стаяў побач, выцягнуўся ў фрунт і ўскінуў правую руку. «Гэтага?» Так-так, заківала галавой жанчына…

Але ўсяго праз пару дзён «хімік», як яго ні пільнавалі сястрычкі, пачаў зьнікаць з аддзяленьня — спачатку на пару гадзінаў, потым на ўвесь дзень. Вяртаўся ён добра нападпітку пад вечар, ледзь пасьпяваючы да «гадзіны Х». А 21-й гадзіне тэлефанаваў дзяжурны са спэцінтэрнату, дзе адбываў пакараньне хлопец, каб праверыць, ці той на месцы. Аднойчы ён не вярнуўся ў прызначаны час…Але пра тое, чым скончылася гэтая сумная гісторыя, крыху ніжэй.

### Распарадак дня

На сьценах калідору ў аддзяленьні, як і паўсюль у падобных установах, вісіць шмат інструкцыяў, плякатаў, нагляднай агітацыі, схемаў эвакуацыі, самадзейных насьценгазэтаў і іншых паперак, на якія ніхто не зьвяртае ўвагі.

«Правілы ўнутранага распарадку» вісяць тут, бадай, з хрушчоўскага часу. Паводле гэтых правілаў, напрыклад, а 7-й раніцы хворых чакае «абуджэньне», а 9-й — сьняданак, а а 11.30 — другі сьняданак! Цудоўны, відаць, быў час, калі хворым падавалі «другі сьняданак» і «падвячорак», а раніцой адбываўся не «пад’ём», але «абуджэньне» і «падрыхтоўка да прыёму лекаў і працэдураў».

З усіх інструкцыяў і плякатаў на беларускай мове ёсьць толькі адзін: «Скажы «не» СНІДу!» На ім мускулістыя рукі разрываюць каноплі, якія нагадваюць калючы дрот. Увогуле, плякатаў на тэму імунадэфіцыту ў шпіталі паўсюль так шмат, што можна падумаць, быццам галоўная праблема хворых — гэта неўпарадкаванае полавае жыцьцё й наркотыкі.

Між іншым, у прыбіральні, пад самай столлю налепка пабеларуску: «Зрабі сябе сам».

А ўвогуле ў аддзяленьні пануе моўная таleранцыя. У мужчынскай палаце вісіць інструкцыя па-ўкраінску: «Вправи для жінок, які перенесли операцію з приводу видалення молочної залози»…

Беларуская мова, калі пачынаеш на ёй размаўляць, вабіць. Адны пачынаюць зь цікаўнасьцю прыслухоўвацца, другія спрабуюць размаўляць па-беларуску.

### Няма

З размовы паміж праваслаўнай манашкай і пажылымі пацыенткамі, выпадкова падслуханай у бальнічным калідоры. «Божая Маці — нашая заступніца на нябёсах, яна намі апекуецца». Старая жанчына ў адказ (катэгарычным тонам): «Божай Маці няма».

### Лінія фронту

Параўнаньне з турмой, прыведзенае напачатку, канечне, будзе няправільным. Хутчэй гэта нагадвае ваенна-палявы шпіталь блізу лініі фронту. Выбухаў і стрэлаў тут, праўда, не чуваць, але амаль кожны дзень у цішыні ідуць апэрацыі — па дзесяць і болей запар. Хірургі змагаюцца за жыцьцё кожнага чалавека, намагаючыся вырваць яго з кіпцюроў падступнага й бязьлітаснага ворага. Не зважаючы на пол, узрост, сацыяльны статус, мову і палітычныя прыхільнасьці хворых. У апэрацыйнай і ў палаце ўсе абсалютна роўныя. Ніякай дыскрымінацыі ці прывілеяў.

На гэтай штодзённай нябачнай вайне, у якой не бывае замірэньня альбо адпачынку, лекары літаральна валяцца з ног ад стомы. Добра, што ёсьць сучасная імпартная апаратура й прэпараты, у асноўным нямецкія. (Цікава, што ў постчарнобыльскую Беларусь нават радыяактыўныя ізатопы ўвозяць зь Нямеччыны.) Але праца ў хірургічным аддзяленьні нагадвае канвэер, які ніколі не спыняецца. Праца на знос.

Вярхоўны галоўнакамандуючы абяцаў хірургам прыбавіць зарплату. Але тыя ўжо ведаюць — у іх цяпер забяруць надбаўкі за анкалягічныя апэрацыі. Тое на тое й выйдзе. Каб лячыць хворых, не патрэбныя палацы са сталі й шкла, патрэбныя нармальныя чалавечыя ўмовы для лекараў і пацыентаў. На гэта дзяржаве не стае грошай. Усё пайшло на гульні ў ракеты й танкі. І яшчэ на спорт. У краіне поўны хакей. А хворыя хай глядзяць яго па тэлевізары.

### Deus ex machina

Позна ўвечары, калі ўсім стала ясна, што зьбеглы хлопец у шпіталь ня вернецца, у палату ўвалілася (менавіта так — увалілася) міліцэйская брыгада. Два сяржанты і малодшы лейтэнант — жанчына з ноўтбукам. Усе без халатаў. Адзін зь сяржантаў — з агромністым жыватом і тлустым тварам — бесцырымонна пачаў дапытваць самага маладога з пацыентаў: дзе твой корэш, ці маеш ягоны тэлефон (у яго сапраўды быў нумар мабільніка таго хлопца) і гэтак далей. Потым грэбліва кінуў у бок мэдсястры: ну, і што ў вашага пацыента за хвароба была? — Я вам не магу адказаць. — Чаму? — шчыра зьдзівіўся сяржант. Маладзенькая сястра ўспыхнула, потым голасам, які зрываўся ад хваляваньня, мужна адказала: «Не забывайцеся, у якой установе Вы знаходзіцеся і як сябе трэба ў ёй паводзіць!» Міліцыянт пацісnuў плячыма і выйшаў з мэдсястрой у калідор. Яму ўрэшце патлумачылі, відаць, што ў пацыента, які зьбег, цяжкая хвароба, якая патрабуе складанай апэрацыі. — Ну вось, цяпер адправяць яго лекавацца ў Жодзіна, там ён і здохне, — падсумаваў вынікі «рэйду» ў шпіталь іншы міліцыянт. Міліцыянты сышлі, нават не разьвітаўшыся і не павярнуўшы галоваў да хворых.

А праз некалькі дзён, у крымінальнай хроніцы на тэлебачаньні пацыенты пазналі таго хлопца ў адным зь сюжэтаў. Ён пабіўся ў віннай краме зь нейкім іншым хлопцам. Ну, і трапіў, зразумела, у міліцэйскі пастарунак. Адтуль дарогі ўжо не было — толькі назад, на «хімію»…У палату зайшла ягоная маці, па асабістыя рэчы, якія той пакінуў. — У мяне добры сын, — сказала яна з сумам, — вось толькі надта любіць выпіць…

За ўвесь час, пакуль хлопец быў у шпіталі, ніхто ніводнага разу не зьвярнуўся да яго зьвысоку ці грэбліва, як і ён да іншых. Увогуле, як гэта ні парадаксальна, у палаце ўсе (ну, амаль усе) любяць адзін аднаго і дапамагаюць у выпадку патрэбы. Свайго роду братэрства.

Чамусьці за мурамі шпіталя ўсё гэта кудысьці зьнікае.

**Віталь Тарас**

# Вэрсаль. Byelorussia

На здымках **Сямёна Печанка** — першы плён рэстаўрацыі ружанскага палацу Сапегаў.

Ружанскі палац, закладзены ў пачатку XVII ст., прычакаў-такі ўвагу з боку рэстаўратараў. Сёлета пачаліся першыя за гады незалежнасьці краіны працы па аднаўленьні ўнікальнага помніка. Дзіва што: велічныя руіны палацу Сапегаў стаяць на бітым турыстычным гасьцінцы Берасьце—Пружаны—Ружаны—Косава. Цяпер руіны маюць шанец рэгенэравацца ў тое, чым былі: палац у стылі позьняга барока з элемэнтамі клясыцызму, беларускі Вэрсаль, як яго называлі. У ліку 26 помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны ён уключаны ў абласную праграму разьвіцьця турыстычнай галіны.

Палац Сапегаў моцна пацярпеў у гады Першай сусьветнай вайны. Да нашых дзён датрывалі галоўны і ўсходні карпусы, аркады, галоўная брама і бакавыя флігелі. У савецкія часы пачыналі аднаўляць галоўную браму, але ў пачатку 1990-х працы спыніліся. «Савецкія» ўмацаваньні з чырвонай цэглы пачынаюць пакрысе разбураюцца.

Рэстаўрацыйныя працы, што аднавіліся ў жніўні, вядуцца пры фінансавай падтрымцы Эўрасаюзу ў рамках праграмы добрасуседзтва. Пра гэта сьведчыць шыльда каля галоўнай брамы. Адна дэталь на той шыльдзе пакідае непрыемнае ўражаньне: назва нашай краіны па-ангельску — Byelorussia — патыхае «саўком».

Найперш спэцыялісты «Берасьцерэстаўрацыі» плянуюць аднавіць галоўную браму і флігелі, што да яе прымыкаюць. Тут мяркуецца стварыць музэй ды іншыя аб᾽екты турыстычнай інфраструктуры.

Перад будаўнікамі, пры канцы лета, у Ружанах пабывалі студэнты Берасьцейскага дзяржунівэрсытэту, якія правялі археалягічныя раскопкі ля ўсходняга флігелю. У Нясьвіжы, прыкладам, дзе шалёнымі тэмпамі аднаўляюць-перабудоўваюць замак Радзівілаў, нічога такога не было. Праца ў Ружанах ідзе без гарачкі. Бо, паводле кіраўніцтва «Берасьцерэстаўрацыі», фінансаваньне невялікае. Мо гэта і лепей. Вэрсалі так і аднаўляюцца: цаглінка да цаглінкі.



**Аркада.**



**Тут некалі быў тэатар.**



**Тут будзе музэй.**




**Эўропа нам дапаможа.**

23 лістапада Беларусь адзначае 50-годзьдзе служэньня аднаго з найстарэйшых беларускіх сьвятароў і найярчэйшых зорак на беларускім небасхіле, духоўнага аўтарытэту беларусаў па ўсім шырокім сьвеце — айца Аляксандра Надсана.

# Мінулае і наступнае стагодзьдзі

Дзякуючы айцу Аляксандру Надсану беларуская мова ўпісалася ў сям'ю сакральных моваў. Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Гэта сюжэт для эпічнага твору: сямнаццацігадовы юнак зь беларускага Нясьвіжу, вучань настаўніцкае сэмінарыі, які ўжо ведаў, што такое камунізм, перад прыходам Чырвонае Арміі разам зь сябрамі пакідае Бацькаўшчыну, трапляе ў Нямеччыну і замест таго, каб служыць райху і бараніць яго, ідзе да францускіх партызанаў, потым трапляе за Альпы — у армію генэрала Ўладзіслава Андэрса, — бярэ ўдзел у баявых сутычках, атрымлівае раненьне, разам з таварышамі па зброі пераяжджае ў Ангельшчыну, дэмабілізуецца, паступае (як былы жаўнер мае льготу) у Лёнданскі ўнівэрсытэт, атрымлівае дыплём бакаляўра... Вось тут спынімся. Уявім: малады бакаляўр Аляксандар Надсан выкладае матэматычны аналіз або працуе ў нейкім вылічальным цэнтры, ходзіць на сустрэчы ўдзельнікаў вайны, робіць прафэсійную кар'еру, мае грошы, машыну, вілу... Што штурхнула яго ехаць у Рым і пачаць навучаньне нанова, засвойваць лаціну і старажытнагрэцкую, патрыстыку і гісторыю Царквы?..

**Аляксандар Надсан у Менску**

Апостальскі візытатар для беларусаў–каталікоў замежжа айцец Аляксандар Надсан прыбыў у Беларусь. У Менску адбудуцца ўрачыстасьці, прысьвечаныя залатому юбілею ягонай сьвятарскай дзейнасьці.

**23 лістапада (нядзеля) а 14 гадзіне** пачнецца ўрачыстая літургія ў касьцёле Сьвятых Сымона і Алены, якую будзе служыць айцец Аляксандар.

**24 лістапада (панядзелак) а 18.30** тамсама адбудзецца грамадзкае віншаваньне Аляксандра Надсана. Віншаваць сьвятара ў гэты дзень будуць Адам Мальдзіс, Алег Трусаў, Аляксей Марачкін, Алена Макоўская ды іншыя навукоўцы, грамадзкія і культурныя дзеячы.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Вось і напішы пасьля гэтага кароткі тэкст пра чалавека, які пражыў 82 гады, памятае мора людзей, ведае безьліч гісторыяў, можа апавесьці, што казалі беларускім сьвятарам біскупы Рыму Ян XXIII і Ян Павал II, апісаць, што рабілася ў Гародзеі (па-цяперашняму Гарадзеі) да вайны, як прыжывaліся беларусы па вайне ў Вялікай Брытаніі...

А мо пачаць зь сябе? З таго, што ўпершыню прозьвішча Надсан я пачуў ці ня ў 1987 годзе ў Вішневе ад ксяндза Ўладзіслава Чарняўскага. Так, гэта было яшчэ да сьвяткаваньня да 1000-х угодкаў Хросту Русі, паездкі айца Ўладзіслава і ягонага маладзейшага калегі Яна Матусевіча ў Лёндан, якая адбылася ў 1988 годзе. А ў сакавіку 1990-га нехта (ці не Міхал Дубянецкі, ці не Сяргей Абламейка?) патэлефанаваў і сказаў, што прыехаў айцец Надсан, што ён будзе служыць літургію ў касьцёле (тады адзіны ў Менску касьцёл быў на Кальварыі).

*У нашай прысутнасьці на Кальварыі адбывалася нешта гістарычнае. Упершыню за 150 гадоў ад часу скасаваньня Уніі ў Менску ўніяцкі сьвятар правіў службу. На нашых вачох памірала імпэрыя.*

Так я першы раз убачыў сьвятара з прозьвішчам Надсан. У тыя хвіліны я й падумаць ня мог, што мне давядзецца яшчэ прачытаць кнігі гэтага сьвятара пра біскупа Часлава Сіповіча, пра кляштар беларускіх айцоў марыянаў у Друі, пра княгіню Марыю Радзівіл і нават быць рэцэнзэнтам.

У нашай прысутнасьці на Кальварыі адбывалася нешта гістарычнае. Упершыню за 150 гадоў ад часу скасаваньня Уніі ў Менску ўніяцкі сьвятар правіў службу. На нашых вачох памірала імпэрыя. Тая імпэрыя, якая спачатку сілком навязвала «ісьцінную» веру, а потым, узяўшы сабе псэўданім «СССР», — «адзіна правільнае вучэньне».

Тое, што імпэрыя памірае, разумеў не адзін я. У 1990-я мне было і сьмешна, і ніякавата, калі ад заходніх палітыкаў я чуў, што яны не чакалі хуткага распаду СССР. Чаго ж вартая іхная навука, іхныя аналітычныя цэнтры, саветалёгія з крэмліналёгіяй! Пракансультаваліся б у нас. А то зьезьдзілі б да айца Рамана Пенткі.

Пра айца Рамана, знаўцу бізантыйскае традыцыі, пробашча ўніяцкае парафіі зь левага берагу Бугу, вядома тое, што ён заклікаў сьвятароў і манахаў вывучаць расейскую мову для будучае місіі. З сталага сьвятара маладзейшыя дабрадушна пасьмейваліся, а калі «разьвіты сацыялізм» памёр, яны з радасным зьдзіўленьнем пазіралі на а.Рамана: і адкуль ён ведаў? Памойму, адказ просты. Напісана ж у Кнізе: «Усё мае свой час». Хіба цяжка засвоіць гэтую праўду?

Усё мае свой час, толькі Ecclessia aeterna і Patria aeterna. Я, мусіць, не памылюся, калі скажу, што гэтую праўду добра засвоіў мітрафорны пратаярэй Аляксандар Надсан. Бо вось 11 сакавіка 1990-га ён служыў літургію не ў царкоўнаславянскай, а ў беларускай мове. Значыць, ужо літургія Яна Залатавуснага перакладзеная? І надрукаваная? Ага, адказалі мне, і

літургія Базыля Вялікага, і літургія раней асьвячаных дароў таксама. І кароткі катэхізіс маецца. На падыходзе другое выданьне...

Патрэбная была вера, што раней ці пазьней пабудаваны на мане, на хлусьні рэжым абваліцца. І патрэбнае было калі ня веданьне, дык адчуваньне, што за тыя дзясяткі гадоў, калі была перапыненая традыцыя царкоўнага жыцьця, народ адвык ад мовы Царквы, ад мовы літургіі. Мабыць, было прадчуваньне, што на літургіі народ будзе не рэцытаваць і сьпяваць, а маўчаць.

І патрэбная была настойлівасьць, каб узяцца і зрабіць гэтую працу — перакласьці літургічныя тэксты. Бо вось і ўладыка Часлаў Сіповіч неяк скептычна ставіўся да намеру маладога сьвятара Аляксандра ўзяцца за такую працу: а ці варта, мо і царкоўнаслявянскае хопіць?

Памятаю, як быў уражаны мой праваслаўны брат, паэт Міхась Скобла, калі ўжо на пачатку XXI стагодзьдзя, прыйшоўшы ў нейкай патрэбе да грэка-каталікоў, убачыў і пачуў іх сьпеў на літургіі: сьпявала ўся царква, старыя і малыя. І Міхась пераканаўся: вось што значыць зразумелая, жывая мова.

Што мелі каталікі бізантыйскага абраду да Аляксандра Надсана? Бадай, адзін-адзіны малечкі малітоўнік айца Льва Гарошкі «Божым шляхам» (1946). Цяпер беларускія грэка-каталікі маюць салідны малітоўнік «Госпаду памолімся», а грэка-каталіцкае духавенства — «Літургікон». Дзякуючы айцу Аляксандру беларуская мова ўпісалася ў сям'ю сакральных моваў, бо ягоныя пераклады літургічных тэкстаў ухваленыя Рымам.

Уявім: малады бакаляўр Аляксандар Надсан працуе ў вылічальным цэнтры, ходзіць на сустрэчы ўдзельнікаў вайны, робіць кар'еру, мае грошы, машыну, вілу... Што штурхнула яго ехаць у Рым, засвойваць лаціну і старажытнагрэцкую, патрыстыку і гісторыю Царквы?..

...У кнізе «Біскуп Чэслаў Сіповіч: Сьвятар і беларус» ёсьць адзін надта цікавы здымак: лёнданскія беларусы віншуюць з 50-годзьдзем сьвятарства пакутніка за веру і Беларусь айца Язэпа Германовіча (Вінцука Адважнага). Сярод віншавальнікаў і малады сьвятар Аляксандар Надсан. З часу таго віншаваньня прайшло 45 гадоў. Вось і айцец Аляксандар адзначае 50 гадоў сваёй пастырскай службы.

Як падумаць, у асобе айца Аляксандра спалучыліся два стагодзьдзі беларускага хрысьціянскага руху. Язэп Германовіч пачынаў свой сьвятарскі шлях у далёкім 1913 годзе, калі выходзіла «Наша Ніва», пачала выходзіць першая каталіцкая газэта «Bielarus». Ягоны сучасьнік і наступнік Аляксандар Надсан сьвяткуе юбілей свайго сьвятарства праз 95 гадоў. Амаль цэлае стагодзьдзе. І як зарука наступнага стагодзьдзя — кагорта маладых беларускіх сьвятароў, якія прыйдуць віншаваць айца Аляксандра ў дзень ягонага юбілею.


Аляксандар Надсан з грузам дапамогі чарнобыльскім раёнам.

# Самы запатрабаваны сьвятар

Айцец Аляксандар Надсан (Бочка) нарадзіўся 8 жніўня 1926 г. у мястэчку Гарадзея на Нясьвіжчыне, скончыў Нясьвіскую настаўніцкую сэмінарыю, дзе вучыўся на матэматыка. Скончыў таксама курсы кіраўнікоў Саюзу Беларускай Моладзі ў Альбертыне, менскую афіцэрскую школу Беларускай Краёвай Абароны. У 1944 г. пакінуў Беларусь, партызаніў у Францыі, далучыўшыся да Руху Супраціўленьня, потым уступіў у войска Андэрса. Па вайне асеў у Ангельшчыне. Паступіў на матэматычны факультэт Лёнданскага ўнівэрсытэту, які пасьпяхова скончыў у 1953 г. Рэдагаваў пэрыёдыкі беларусаў замежжа; быў адным з стваральнікаў і ўзначальваў (1951—1953 г.) Згуртаваньне беларусаў Вялікае Брытаніі; быў адным з кіраўнікоў Беларускага Акадэмічнага Каталіцкага Аб'яднаньня «Рунь», што гуртавала беларускую інтэлектуальную моладзь Заходняе Эўропы й ЗША. Актыўна супрацоўнічаў з найбуйнейшым беларускім духоўным асяродкам на Захадзе — Беларускай Каталіцкай Місіяй у Вялікай Брытаніі.

Не без уплыву першага Рэктара Місіі Чэслава Сіповіча прысьвяціў жыцьцё сьвятарскаму служэньню. У 1953 г. паехаў у Рым, дзе шэсьць гадоў вывучаў багаслоўе ў Грэцкай калегіі. Сярод студэнтаў з розных краінаў, якія ўсе мелі літургіі на родных мовах, у будучага сьвятара паўстала пытаньне, чаму беларусы ня маюць магчымасьці славіць Бога па-свойму.

23 лістапада 1958 г., магістрам багаслоўя, ён прыняў сьвятарскае сьвячаньне. У 1959 г. вярнуўся ў Лёндан, дзе ўключыўся ў беларускае жыцьцё ўжо ў якасьці сьвятара, ад 1966 году кіраваў школай-інтэрнатам імя Кірылы Тураўскага пры Беларускай Каталіцкай Місіі — для хлопчыкаў зь беларускіх сем'яў розных веравызнаньняў з краінаў Заходняе Эўропы.

У 1971 г. у Лёндане адкрылася Беларуская бібліятэка імя Скарыны, і а.Аляксандар стаў яе нязьменным кіраўніком, папаўняючы бібліятэчныя фонды друкаванымі скарбамі беларускай культуры, што хутка зрабіла Бібліятэку найбуйнейшым беларускім кнігазборам за межамі Беларусі, які прываблівае дасьледчыкаў з усяго сьвету. Пры Бібліятэцы працуе музэй, дзе сабраныя матэрыяльныя сьведчаньні шматстагодзьдзевай гісторыі Беларусі.

У 1981 г. а.Аляксандар стаў Рэктарам Беларускай Каталіцкай Місіі ў Вялікай Брытаніі, а неўзабаве й апостальскім візытатарам для беларусаў-каталікоў замежжа — і ў гэтай якасьці рэгулярна адведваў беларускія асяродкі ва ўсіх кутках сьвету, ад Аўстраліі й Новай Зэляндыі да абедзьвюх Амэрыкаў.

Цягам гадоў ён працаваў зь перакладамі бізантыйскіх літургічных тэкстаў на беларускую мову — праца, якая зазвычай робіцца вялікімі аўтарытэтнымі камісіямі і ўяўляецца непад'ёмнаю для аднаго чалавека. Надсан здолеў зрабіць якасныя й натхнёныя пераклады велізарнага корпусу тэкстаў літургічнае традыцыі Ўсходняга Хрысьціянства, сам склаў службы беларускім сьвятым і на вялікія беларускія сьвяты (Служба пра памнажэньне любові, Службы да сьвятых Эўфрасіньні Полацкай і Кірылы Тураўскага). Ён быў першым сьвятаром у сьвеце, які пачаў сыстэматычна ўжываць беларускую мову ў багаслужэньні.

Два дзесяцігодзьдзі ён быў адзіным чалавекам, хто штодня літургічна маліўся за Беларусь і па-беларуску.

Як мінімум два дзесяцігодзьдзі ён быў адзіным чалавекам, хто штодня (!) літургічна маліўся за Беларусь і па-беларуску. Малітоўнік «Госпаду памолімся» (Менск, 2002) стаўся як афіцыйным тэкстам набажэнстваў Беларускае Грэка-Каталіцкае Царквы.

Ён стаўся першым чалавекам з Заходняга сьвету, хто прыехаў у Беларусь пасьля Чарнобыльскай аварыі з грузам лекаў для ахвяраў радыяцыі. Гэта быў ягоны першы візыт на Бацькаўшчыну пасьля вайны. Ён утварыў Камітэт дапамогі ахвярам радыяцыі, езьдзіў па ўсім сьвеце і дзе мог выступаў у друку ды на тэлебачаньні з аповедамі пра трагедыю Беларусі — і людзі адгукаліся. У выніку ўтварылася некалькі самастойных арганізацыяў, якія — ужо без удзелу айца — дапамагаюць беларусам пераадольваць наступствы Чарнобылю.

Айцец Аляксандар застаецца самым запатрабаваным беларускім сьвятаром у сьвеце. Штогод на Каляды й Вялікдзень беларускія радыйныя рэдакцыі ды газэты просяць яго пра казані — заўсёды глыбока духоўныя, зьмястоўныя і па-чалавечы цёплыя.

Ягоная навуковая бібліяграфія складаецца зь дзьвюх з паловай сотняў публікацыяў. Дзякуючы надзвычай шырокай асьвеце і валоданьню многімі мовамі ён разблытаў многія навуковыя загадкі. Так, Надсан быў бадай адзіны, хто мог на падставе Капэнгагенскае Пасхаліі вызначыць год выданьня Скарынавае «Малой падарожнай кніжкі» — 1522, а не 1523—1524, як пісалі дагэтуль. Ён «расчытаў» аль-кітабы беларускіх татараў ды ўвёў іх у сусьветны навуковы ўжытак, запачаткаваўшы такім чынам беларускую кітабістыку. Ён ведае на памяць усе беларускія друкарні ад часоў Скарыны да XX стагодзьдзя і можа апавесьці, хто, што і як у іх выдаваў і якія беларускія асаблівасьці былі ў тых кнігах. Ягоная праца пра Кірылу Тураўскага дагэтуль застаецца найлепшым аналізам жыцьця, служэньня й творчасьці гэтага самага яркага беларускага сьвятога й пісьменьніка.

Ён зладзіў шэраг міжнародных канфэрэнцыяў па розных аспэктах беларусістыкі, у тым ліку прысьвечаную 1000-годзьдзю Хрысьціянства ў Беларусі (1988). Актыўна супрацоўнічаў з навуковым ангельска-беларускім таварыствам, чытаючы лекцыі ды друкуючы артыкулы ў часопісе «Journal of Byelorussian Studies», хрысьціянскім часопісе «Божым шляхам», «Весьніку беларускага каталіцкага душпастырства», які сам і выдаваў. Апошнія гады а.Аляксандар прысьвяціў дасьледаваньню гісторыі беларускага Хрысьціянства XX ст. (кнігі «Біскуп Чэслаў Сіповіч: Сьвятар і беларус», па-беларуску (2004) і па-ангельску (2007), «Pro patria aliena: Кляштар беларускіх айцоў марыянаў у Друі» і «Княгіня Радзівіл і справа адраджэньня Уніі ў Беларусі» (абедзьве 2006)).

Сёлета — нарэшце! — навуковая дзейнасьць айца Аляксандра будзе адзначаная ганаровым Дактаратам, які дае яму ў Вільні Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт.

ІД


На аўдыенцыі ў папы Яна Паўла II.

# Тэатар без пралетарыяту і буржуазіі

Пра прэм'ерны паказ спэктаклю Анатоля Шурпіна «Хто пакахае мадам» піша **Андрэй Расінскі.**


АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ
Анатоль Шурпін.

П'есам Анатоля Шурпіна, складзеным 13 гадоў таму, доўга не шанцавала. У тэатральных колах іх ведалі, усяляк хвалілі — але ставіць ніхто не рызыкаваў.

Толькі ў малой ступені гэта зьвязана зь яршыстым характарам драматурга, які на пачатку 1990-х прыехаў з Баранавіч у Менск і хутка заявіў пра сябе, прыдумаўшы тэатар блефу.

У гэтым тэатры няма каўтуна і кананічных лапцяў, кірзавых ботаў і гімнасьцёрак, побытавага шчасьця, прапахлага порахам, — і выцця пад доляй народнаю. Адсутнічаюць і падпольныя, актуальна-палітычныя сьпевы дый арыштаваныя гледачы. Драматург прызнаўся, што ня любіць «пралетарыят і буржуазію». Але букалічнымі пэйзажамі захапляецца ў яшчэ меншай ступені.

Тэатар блефу — гэта арыстакратыя ў чаканьні гільятыны, царызм перад сконам, карнавал мёртвых душаў (з ідэальнай мэерхольдаўскай пастаноўкаю «Рэвізора»).

...Зьляканыя арыстакраты запрашаюць доктара Гіятэна (менавіта так — бязь «ль»), каб ён спыніў «эпідэмію свабоды». Ветлівы доктар бярэцца за справу й так захапляецца, што адсякае галовы й прадстаўнікам паноўных клясаў («Пан Гіятэн»).

...На Каляды сужэнства Недарэзавых зашываецца ад людзей і сьвятла — у задушлівую каморку, каб бавіць час са старымі рэчамі й знайсьці ў лазеньцы труп (п'еса «Тра-та-та»).

…У кампаніі прыдуманых графіняў і баранэсаў, на банкеце багатых сёстраў Гаргонаў, якія вандруюць па гарадах і крадуць маладосьць («Гульня са Сфінксам»), у абдымку з царом Эдыпам, які не асьляпіў сябе, а, наадварот, ганарыцца інцэстам («Эдып у Агоніі»), — рэжысёр ставіць сябе як хаджалы і сьвецкі цынік, што вядзе халодны рэпартаж з апраметнай.

П'еса Шурпіна «Хто пакахае мадам», прэм'ера якой адбылася 16 лістапада ў Тэатры беларускай драматургіі, — першая пастаўленая з даробку драматурга. Пастаўленая па-беларуску, у перакладзе з расейскай колішняга міністра культуры, пісьменьніка Анатоля Бутэвіча.

П'еса ня мае прыкметаў рэалізму. Аднак яе можна назваць аўтабіяграфічнай. Падчас навучаньня аўтара ва ўнівэрсытэце культуры ды ў Акадэміі мастацтваў прататыпы герояў п'есы — тамтэйшыя выкладчыкі — фігуравалі ў ёй пад сапраўднымі імёнамі. І не былі ад гэтага ў захапленьні. Са скандалам Шурпін зьмяніў унівэрсытэт культуры на Экспэрымэнтальны курс Вячаслава Ракіцкага, на якім гэты тэатразнаўца і рэжысёр у 1990-я рыхтаваў драматургаў; кідаў і ізноў паступаў у Акадэмію мастацтваў — нарэшце давучыўся там на тэатральнага крытыка.

У п'есе «Хто пакахае мадам» дзьве сюжэтныя рамкі. Першая: тры акторы-кастраты, якія памятаюць «шчасьлівыя часы імпэратара Дыяклетыяна», ладзяць для шаноўнай баранэсы Штэйн умоўна-гратэскнае прадстаўленьне. Другая — уласна прадстаўленьне. Каб зэканоміць на прыслузе, а старасьць не здавалася нудкаю, скваплівыя ўдовы мадам дэ Лату і фраў Герц жывуць пад адным дахам. Дамы тыраняць служанку Лізавету (прывітаньне «Злачынству і пакараньню») — і чакаюць ласага на грошы абата Івавэра, якога прымроілі…

Дзея адбываецца на фоне чырвоных, як апошняя жарсьць, дэкарацыяў — зь вялізным сэрцам-акенцам (сцэнаграфія Ігара Анісенкі); пад выбеленымі маскамі-тварамі; пад хрыпата-млявую музыку кубрыкаўскага «Зьзяньня» (музычнае афармленьне Цімура Каліноўскага).

Рэжысёр Вэнэдыкт Растрыжэнкаў добра падагнаў п'есу для сцэны, скараціўшы літаратурныя дыялёгі — і сьвядома забыўшыся на абавязковы для беларускага тэатру побыт. Гэта — чысты тэатар, пазбаўлены вясковага й палітычнага прыгону, нязмушаная і свабодная гульня, якая і дазваляе акторам праявіцца напоўніцу, імправізаваць.

Трэба бачыць зьвяглівую грубіянку, інтрыганку з бутэлькаю каньяку — фраў Герц у выкананьні Галіны Чарнабаевай. Як і сёйная духоўная сваячка «бэбі Джэйн» (з культавае карціны Рычарда Олдрыча «Што здарылася з бэбі Джэйн»), фраў Герц любіць опэрныя сьпевы (пастаўленыя пад кабарэтныя нумары Марлен Дытрых і Лайзы Мінэлі) ды цешыцца скандаламі.

Затое Тацяна Мархель у ролі мадам дэ Лату — мройліва-рамантычная, шчымліва-даверлівая, бяздумная і мэлянхалічна-імпульсыўная ў трагічнай апошняй помсьце. Ейны голас то дрыжыць, то лашчыць, то зрываецца. У дзівосным капелюшы, багатая, але безнадзейна самотная мадам штодзень перакazвае ўласныя сны і жаданьні блытае зь яваю.

Абат Івавэр узяты ў п'есу не з побытавых сатырычных казак — і нават не з анэкдотаў часоў Адраджэньня. Гэта фікцыя, мроя, юнгіянскі архетып суцяшальніка для сталых жанчынаў. Актор Сяргей Шымко зь неверагоднаю гратэскавай плястыкай грае і абата, і служанку Лізаньку. (У тэатры Валер'я Анісенкі для актораў, каб тыя маглі падтрымліваць форму, зробленыя сілоўня й танцавальная заля!)

Тэрыторыя п'есы — гэта тэрыторыя граху, калі неба замкнёнае, мінулага не вярнуць, засталіся фальшывыя мроі, а ў філіжанцы кавы — адна атрута на ўсіх. Але няслушна лічыць гэта эстэтызацыяй зла, як у шумных гасьцявых пастаноўках Рамана Віктюка, ад якіх рыдаюць 60-гадовыя прыхільніцы. Сьледам за Гогалем Шурпін мог бы сказаць: «Мой станоўчы герой — сьмех». І сьмеху гэтага ў п'есе даволі.

А дзякуючы рэжысёру і акторам зьявіўся яшчэ адзін станоўчы герой — спачуваньне. Спачуваньне нязьдзейсьненаму жыцьцю, спыненаму часу, загубленым мроям і зачыненаму прышламу. Гэта ідэальны спэктакль для сёньняшняй Беларусі, якая жыве ў бясчасьсі і для якой перакручаны гратэскавы сьвет — адхланьне. Гэта партрэт эпохі, якую можна палюбіць хоць бы за п'есы Анатоля Шурпіна.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### На берагах Гудзону... Влтавы... Даўгавы...

**Беларус 2008. Літаратурны альманах беларускіх пісьменьнікаў замежжа.** — Нью-Ёрк: Выдавецтва газэты «Беларус», 2008. — 205 с.

У Нью-Ёрку другі год запар выходзіць альманах тых беларускіх літаратараў, якія стала жывуць за мяжой. Геаграфія прыгожага пісьменства прэзэнтаваная так шырока, як рэдка калі: ад сумежных Літвы, Польшчы, Расеі і Латвіі да далёкіх Аўстраліі, Канады, Ізраілю і ЗША. Сярод аўтараў складанкі: Сяржук Сокалаў-Воюш, Макс Шчур, Віталь Воранаў.

Тэндэнцыя: эмігранцкія аўтары пакрысе пакідаюць свой традыцыйны плач аб пакінутай старонцы, прынамсі, зьмяншаюць яго частату, засяроджваючыся на сваіх новых краінах. На радасьць цікаўным да ўсяго новага чытачам у Беларусі і на карысьць беларускай прысутнасьці ў сьвеце.

Акрамя арыгінальных твораў у зборнік увайшлі таксама пераклады. Аўстраліец Віктар Кавалеўскі абеларусіў Артура Кларка, а канадыйка Ірына Верабей пераклала індыянскія легенды.

### Лісты з апраметнай

**Незабыўныя «Ксівы». Вершы з падпольнай канцлягернай перапіскі з Ларысай Геніюш. Васіль Супрун.** — Менск, 2008. 3-е выданьне. 83с. — 299 ас.

«Ксівы» — гэта кароткія скручаныя цыгаркай запіскі, якія зэкі пасылаюць адно аднаму. Васіль Супрун, гулагаўскі вязень, адзін з чальцоў моладзевай антысталінісцкай арганізацыі «Чайка», якая дзейнічала на Слонімшчыне ў першыя паваенныя гады, у гэткі спосаб ліставаўся з Ларысай Геніюш, таксама зьняволенай у сталінскіх лягерах.

Іх падзялялі гады і драты, але ўзмах пяра зьнішчаў адлегласьць. У лірычным ключы перапіска двух вязьняў прасякнутая любоўю і поўніцца шчымлівымі прызнаньнямі, магчымымі адно сярод людзей, якія зазіраюць Малоху ў вочы.

**Лявон К**

## СЬЦІСЛА

### V зьезд беларусаў сьвету

Прайшло паседжаньне Малой Рады МГА «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына», асноўным пытаньнем, якога была падрыхтоўка да V зьезду беларусаў сьвету. Папярэдняя дата прызначаная на 18—19 ліпеня 2009 г. (Менск).

### Плябань адродзіцца

Створана рабочая група па распрацоўцы канцэпцыі Музея вёскі Плябань Маладзечанскага раёна. Такое рашэнне прынята на пасяджэнні круглага стала па пытанні канцэпцыі музея, што прайшло ў рамках агульнабеларускай кампаніі «Будзьма!». Паводле яго слоў, пасяджэнне прайшло пры падтрымцы мясцовых уладаў.

### Зьнесьлі дом Зоі Каўшанкі

Калісьці ў Вільні на вуліцы Летняй гэты дом быў прытулкам гасьцiннасьці й беларушчыны. Але ён так і ня стаў ні музэем, ні сядзібаю сьвядомага беларуса, як хацела таго гаспадыня перад сыходам у іншы сьвет. Дому пані Зоі больш няма. На ягоным месцы — куламеса гразі й дзьве вялізныя яміны, паведаміў у сваім LJ ivansaj.

Зоя Коўш (Каўшанка) — сястра беларускага дзеяча ў замежжы, сьвятара Сьвятаслава Кауша. Скончыла Віленскую беларускую гімназію, Віленскі ўнівэрсытэт (праўніцтва). Брала ўдзел у беларускім грамадзкім жыцьці ў Вільні ў 1930—40-х. Уваходзіла ў Беларускі студэнцкі саюз. Улетку 1944 г. выехала ў Нямеччыну. У 1947 была арыштаваная савецкімі органамі бясьпекі, асуджана на 10 гадоў лягероў. Вярнулася ў другой палове 1950-х, жыла ў Вільні.

**Паводле ivansaj, БелаПАН**



## Tlusta Lusta прэзэнтуе дэбютны альбом

Пераможцы «Басовішча—2008» гарадзенскі гурт Tlusta Lusta прэзэнтуюць «Blin piersy» — менавіта так завецца іх дэбютная праца.

«На нашых канцэртах звычайна не чуваць словаў у песьнях, дык цяпер урэшце пачуеце, пра што мы сьпяваем», — кажа лідэр каманды Кірыл Богуш. Гарадзенцы пісалі альбом на ўласныя грошы, хоць у якасьці прызу атрымалі 20 гадзінаў бясплатнага запісу на студыі ў Беластоку. «Але пасьля «Басовішча» да нас ніхто наконт запісу не зьвярнуўся, таму мы паехалі ў Ваўкавыск і запісалі альбом там», — кажа Кірыл.

У выніку двухмесяцовай працы і зьявіўся дыск «Blin piersy», куды ўвайшлі 11 песень. Акром вядомага ўжо па канцэртных выступах гарадзенцаў кавэру на песьню МакSim, на дыску ёсьць яшчэ адна чужая песьня — кавэр на адзін з твораў герояў гарадзенскага панк-року — гурта Deviation.

На канцэрце гурт Tlusta Lusta падтрымае каманда Піта Паўлава GARADzKIJA. Піт адзначыў, што «гэтым канцэртам яны хочуць падсумаваць усе свае папярэднія выступы да спраўдзіць у канцэртных умовах гучаньне новых песень».

**SB, ТГ**

Канцэрт пройдзе **26 лістапада ў DA-club (вул.Броўкі, 22) у 19.00**. Квіткі: 15—20 тыс. рублёў, замова праз тэл.: (029) 649-08-88, (029) 688-61-74.

# Атлянт пакінуў неба

У Менску, Вільні, Кракаве і Варшаве, адзначаючыся ў картках, узятых для прагляду рукапісаў, я нязьменна знаходзіў подпіс Генадзя Кісялёва. А хто пасьля яго? Піша **Аляксандар Фядута**.



**Генадзь Кісялёў**

нар. 19 сакавіка 1931 г. у Каломне (Маскоўская вобласьць), скончыў Маскоўскі гісторыка-археаграфічны інстытут, у 1953—1956, 1960—1971 гг. працаваў у архівах Вільні. З 1971 г. працаваў у Інстытуце літаратуры Акадэміі навук. Дасьледаваў літаратуру і нацыянальны рух XIX ст., жыцьцё і творчасьць Каліноўскага, Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча, Вярыгі-Дарэўскага, а таксама Коласа і Купалы. У яго засталіся жонка Яніна, дочкі Лія і Натальля і ўнук Ян. Пахавалі Генадзя Кісялёва 17 лістапада на Кальварыі.

Этнічны вялікарос, ён закахаўся ў беларускую гісторыю і культуру і прысьвяціў ім усё жыцьцё. І стаў дасьледнікам, якіх мала было ў нашых гуманітарных ведах. Каго можна прыраўнаць да яго паводле маштабу зробленага? Нябожчык Сьцяпан Александровіч, жывы і здаровы Адам Мальдзіс, хворы Ўладзімер Мархель. Як чатыры атлянты, стаяць яны ля ўваходу ў храм беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя, даводзячы: народ беларускі жыў і тады, калі самое слова «Беларусь» было высокім загадам выведзена з ужытку. Жыў — і даваў сьвету вялікіх харызматыкаў-змагароў, нястомных пісьменьнікаў, самабытных і не падобных на іншых нават тады, калі ім даводзілася пісаць на чужых мовах.

У гэтым шэрагу Генадзю Кісялёву выпала адмысловая місія. Менавіта ён давёў, што ананімных тэкстаў не бывае — што не гараць рукапісы, не зьнікаюць бязь сьледу людзі. Ён вярнуў беларусам імёны бясспрэчных нашых клясыкаў — Вікенція Равінскага, аўтара «Энэіды», і Канстанціна Вераніцына, стваральніка «Тараса на Парнасе».

Кожны архівіст ведае: можна дзясяткі і сотні разоў пераглядаць вопісы, гартаць запыленыя старыя кнігі — але ўдача стаць першаадкрывальнікам усьміхаецца толькі вялікім працаўнікам, якія цьвёрда ведаюць, што менавіта яны хочуць знайсьці. І тыя ўнікальныя знаходкі, якія выпалі на долю Кісялёва, сталі ўзнагародай за ягоную адданасьць тэме і шматгадовую цяжкую працу. Працу выдаўца і камэнтатара рукапісных помнікаў, працу карпатлівага біёграфа, які ўмеў бачыць гістарычную значнасьць кожнага факту.

Калі я ўзяў у рукі том «Кастусь Каліноўскі», падрыхтаваны спадаром Генадзем для «Беларускага кнігазбору», я зразумеў: гэта — помнік. Помнік і герою кнігі, і яе ўкладальніку і камэнтатару. Бездакорная праца Кісялёва — нібы арыенцір для будучых пакаленьняў дасьледнікаў. Усім нам ісьці — і глядзець уперад, на пабудаваны ім як адным з архітэктараў велічны будынак.

Толькі ці ёсьць каму ісьці наперад? XIX стагодзьдзе, горкае і болесна адчувальнае, палітычна «нядобранадзейнае», даўно не знаходзіцца ў полі зроку нашых дасьледнікаў. Каму яно цікавае? Язэпу Янушкевічу, Мікалаю Хаўстовічу, Ігару Запрудзкаму. І — усё? Налета — трагічны юбілей пакараньня Каліноўскага. Хто варты адзначаць яго?

Сыход Генадзя Кісялёва — цяжкі напамін пра той вакуўм, які ўтвараецца па меры сыходу старэйшага пакаленьня. Самыя актыўныя з тых, хто мусіў прыняць эстафэту ў нашых атлянтаў, у найлепшыя гады сваёй маладосьці сышлі хто ў палітыку, хто ў бізнэс. Нехта сканцэнтраваўся на больш «удзячных» эпохах — кшталту росквіту ВКЛ.

Часткова у гэтым быў вінаваты і сам спадар Генадзь. Зробленае ім было настолькі маштабным — згадаем «Пачынальнікаў», «Сейбітаў вечнага», «Радаводнае дрэва», «Герояў і муз», «Расшукваецца клясык…», «Ад Чачота да Багушэвіча», — нібы рукі апускаюцца: здаецца, ён усё ўжо знайшоў і парабіў. Па сабе ведаю: у Менску, Вільні, адзначаючыся ў картках, узятых для прагляду рукапісаў, я нязьменна знаходзіў ягоны подпіс. Як сьведчаньне ягонага высокага прафэсіяналізму і сумленнасьці навукоўца: ведаю, бачыў, чытаў…

І калі сёньня я думаю пра гэтага надзіва сьціплага чалавека, які нібыта сьвядома затушоўваў уласныя заслугі, мне здаецца, што неба, якое ён так доўга і магутна ўтрымліваў, усё-ткі не ўпадзе. Зробленага Кісялёвым і ягонымі аднагодкамі, дадзенага імі штуршка дастаткова, каб забыцьцё больш не абрынулася на беларусаў.

# Кротус Генус

Калегі пра **Генадзя Кісялёва**.

**Уладзімер Кароткі, гісторык літаратуры:** Кісялёў не зьяўляўся ні палітыкам, ні грамадзкім дзеячам, але ў сваіх паводзінах быў і тым, і другім. Выхоўваў грамаду праз факт, праз праўдзівую інфармацыю. І сам займаў актыўную грамадзянскую пазыцыю. Калі ў 1970-я гады пачалася кампанія супраць літаратуразнаўцаў Вячаслава Зайцава і Міколы Прашковіча (першага зачынілі ў псыхіятрычнай клініцы, другога звольнілі бяз права аднаўленьня на працы), дык на адным з паказальных сходаў, што мелі мэтаю зганьбіць навукоўцаў, Генадзь Васілевіч не прагаласаваў за асуджэньне апальных літаратуразнаўцаў, быў адзіным, хто ўстрымаўся. На той час гэта было ўсё роўна як выклік уладзе.

Усё астатняе — у ягоных кнігах. Ён менавіта тое зычыў, што адное мінулае беларускай навукі і яе будучыню, бо ягоныя адкрыцьці шмат у чым вызначальныя для далейшага разьвіцьця навуковых ідэяў.

**Адам Мальдзіс, гісторык, літаратуразнаўца:** Генадзь Кісялёў — сумленьне нашага літаратуразнаўства. Гэта мы ў савецкія часы хісталіся, а ён заўсёды быў непарушны. Верыў у зорку беларускай літаратуры. Зь іншага боку, калі зьвесткі пра таго ці іншага аўтара былі неправераныя, ён іх заўсёды адпрэчваў, ня быў прыхільнікам будаўніцтва легендаў — апэраваў толькі фактамі. Не ствараў іконаў, хутчэй вяртаў праўдзівую інфармацыю. Тут у ім праяўляўся сапраўдны навукоўца. А яшчэ — аглядаў постаці беларускай літаратуры ўсёабдымна, комплексна. І як літаратараў іх ацэньваў, і як людзей з усімі іхнімі заганамі і вартасьцямі. Напэўна, таму яму ўдавалася зрабіць так многа адкрыцьцяў.

**Віктар Жыбуль, паэт, літаратуразнаўца:** Фактычна Генадзь Кісялёў сваімі кнігамі падахвоціў мяне займацца гісторыяй літаратуры. Ён настолькі цікава апісваў этапы сваіх архіўных пошукаў, што ягоныя досьледы заўсёды чыталіся як захапляльныя дэтэктывы.

**Арсень Ліс, доктар філялягічных навук, літаратуразнаўца:** Ён дасьледаваў ня толькі літаратуру, але і лёс нашай пакутнай інтэлігенцыі, чыя трагічнасьць у XIX стагодзьдзі не саступала стагодзьдзю папярэдняму. Дазволіў нам усё адно як рэальна ўбачыць такіх дзеячаў як Каліноўскі, Багушэвіч. Падняў велізарны архіўны матэрыял, пакінуўшы запатрабаваную спадчыну і пасьлядоўнікаў, такіх, як Янушкевіч. Быў грунтоўны ў сваіх працах, скрупулёзны і разам з тым, за сухім дакумэнтам бачыў жывое жыцьцё.

**Міхась Тычына, доктар філялягічных навук, літаратурны крытык:** На пытаньне, хто такі Кісялёў для нашай культуры, найлепшым чынам адказваюць назвы ягоных жа кніжак: «Сейбіт вечнага», «З думай пра Беларусь», «Жылі-былі клясыкі». Ён сапраўды і сейбіт на літаратуразнаўчай ніве, і чалавек, які прысьвяціў сваё жыцьцё Беларусі, і клясык літаратуразнаўства.

**Пятро Васючэнка, літаратуразнаўца, загадчык катэдры беларускай мовы і літаратуры Лінгвістычнага ўнівэрсытэту:** Кісялёў як чалавек, які палову (без перабольшваньня!) жыцьця прабавіў у архівах, меў пачуцьцё гумару. Ананімны аўтар «Лысай гары», пакпіўшы зь яго, напісаў такія радкі:

Адкрыцьця гэтага ня зробіць —
Хоць зад натрэ да мазалёў —
Ні крот Сьцяпан Александровіч,
Ні кротус Генус Кісялёў!

Дык спадар Генадзь не пакрыўдзіўся ані і нават пачаў гэтак падпісваць некаторыя свае лісты.

Як навукоўца — фэномэн. Чалавек з маскоўскай адукацыяй, рафінаваны расейскі інтэлігент, захоплены беларускай літаратурай, прысьвяціў усё сваё жыцьцё ёй. Пертварыў гісторыю беларускай літаратуры

XIX стагодзьдзя ў захапляльны дэтэктыў. Але ў XIX стагодзьдзі не адседжваўся — цікавіўся сучаснай літаратурай. Жыва рэагаваў на сучаснасьць.

**Запісаў Павал Касьцюкевіч**

# Каго ён толькі ні пераклаў!

У канфлікце з чаргінцоўскім саюзам ён прынцыпова ўзяў процілеглы бок. Аляксандра Дракахруста, зь якім сорак гадоў сябраваў, прыгадвае **Валянцін Тарас**.



**Аляксандар Дракахруст**

14 лістапада ня стала Аляксандра Дракахруста. Сьмерць засьпела яго праз сем дзён пасьля таго, як паэт, перакладчык і журналіст адсьвяткаваў сваё 85-годзьдзе. З-пад пяра Аляксандра Дракахруста выйшлі пераклады на расейскую мову вершаў Рыгора Барадуліна, Міколы Аўрамчыка, Анатоля Грачанікава, Сьцяпана Гаўрусёва і многіх іншых беларускіх паэтаў. Ён прырос да беларускай літаратуры і заўсёды быў на баку тых, хто адстойваў яе правы.

**Радыё «Свабода»**

Гэта быў цікавы, добры, рахманы, але прынцыповы чалавек. Хоць у нас сем год розьніцы, але так сталася, што мы зь ім разам — людзі мінулай вайны. Яна нас выхавала, ды што і казаць, зрабіла людзьмі. Аляксандр прайшоў усю вайну, ад званка да званка, штурмаваў Бэрлін. Нават ня ведаючы, што яго бацька быў расстраляны перад самай вайной, а маці адпраўленая ў ГУЛАГ. Сорак з гакам гадоў прапрацаваў у вайсковых газэтах. Сьпярша, адразу пасьля вайны, рабіў на Далёкім Усходзе. Але ў 1962-м, пад уплывам візыту беларускіх пісьменьнікаў на чале з Іванам Антонавічам Брылём, пэўна, адчуўшы роднасьць, намысьліў пераехаць дадому ў Беларусь. Тут знаёміў ужо расейскага чытача зь беларускімі паэтамі — каго ён толькі ні пераклаў! У канфлікце з чаргінцоўскім саюзам прынцыпова ўзяў процілеглы бок, і ў сваім вялікім веку хадзіў на судовыя паседжаньні — браў судовы працэс да сэрца, праблемы Саюзу пісьменьнікаў прымаў, як свае ўласныя.

Нам будзе не хапаць яго ўсьмешкі, яго шчырай зацікаўленасьці ў чужым жыцьці. Праўда, горкая страта».

**Запісаў ЛК**

### Нашчадкі бронзавага Суворава ў Менску

У Менску на вул.Заборскага, ля суворaўскай вучэльні, усталяваная скульптура «Маленькі генэрал» аўтарства скульптара Жбанава. Урачыстае адкрыцьцё статуі адбылося 6 лістапада. Вастраслоўы ў інтэрнэце ўжо ахрысьцілі яго «Колем».

Уладзімер Жбанаў вядомы сваімі малымі гарадзкімі скульптурамі: фурманкай каля ратушы на пляцы Свабоды, а таксама «Дзяўчынкай пад парасонам» і «Курцом» у Міхайлаўскім сквэры між вуліцамі Кірава і Ленінградзкай. Зробленыя ў натуральную велічыню, без пастамэнтаў, жбанаўскія скульптуры правакуюць на інтэрактыўнасьць: калі-нікалі менчукі ці госьці сталіцы прасоўваюць цыгарэту ці канчар паміж указальным і сярэднім пальцамі «Курца», а на бронзавых сядзеньнях фурманкі заўсёды стае аматараў паздымацца.




### Леаніды вяртаюцца да Зямлі

Зямля праходзіць праз адзін з найбуйнейшых мэтэорных патокаў Леаніды з 10 да 23 лістапада. 17 лістапада быў пік: каля 2-й ночы падала да 130 «зорак». Паток Леаніды пераменны (ад 20 да 130 мэтэораў у гадзіну), у залежнасьці ад таго, ці праходзіць Зямля пры руху вакол Сонца праз цэнтар патоку ці зьмяшчаецца. Асаблівасьць Леанідаў — высокая яркасьць мэтэораў. Гэта тлумачыцца вялікай хуткасьцю ўварваньня часьцінак у верхнія слаі атмасфэры — 71 км за сэкунду.

Паток можна назіраць з боку сузор'я Льва ў яснае надвор'е, лепш за горадам, дзе сьвятло не перашкаджае. У найбліжэйшыя ночы мэтэоры будуць бачныя ў начным небе не радзей за адзін раз на тры хвіліны. Штогод Зямля праходзіць 30 мэтэорных патокаў рознай інтэнсіўнасьці.

### Беларускамоўны «Панасонік»

Пачынаючы з мадэльнага шэрагу 2009 г., лічбавыя бяздротавыя тэлефоны стандарту DECT фірмы Matsushita Electric (гандлёвая марка Panasonic) будуць мець, апроч іншых, мэню дысплэю і на беларускай мове.

Гэтае рашэньне, не прадыктаванае беларускім заканадаўствам, было прынятае Panasonic, сусьветным лідэрам стандарту DECT, цалкам добраахвотна.

Тры гады таму Дзяржаўны камітэт РБ па стандартызацыі і мэтралёгіі ўжо быў падрыхтаваў Дзяржаўны стандарт, які абавязваў усіх вытворцаў электронікі забясьпечваць усю прадукцыю, якая пастаўляецца ў РБ, беларускамоўнымі інструкцыямі карыстальніка і мэню. Panasonic, Samsung і іншыя сусьветныя лідэры рынку электронікі былі гатовыя адаптавацца да новага стандарту на працягу некалькіх месяцаў. Але, парадаксальна, менавіта айчынныя вытворцы — Гарызонт, Віцязь і іншыя — заблякавалі новы стандарт, які так і не набыў законнай сілы.

Гіганты сусьветнага рынку электронікі — таксама і піянэры беларускамоўнай вонкавай рэклямы, бо першымі пачалі ўжываць беларускую мову на рэклямных шчытах. Пазьней гэтая ініцыятыва была падхопленая і большасьцю галоўных аўтавытворцаў.

### У Гомелі кіроўца зьбіў трох чалавек

У Гомелі супрацоўнікамі праваахоўных органаў затрыманы кіроўца «мэрсэдэса», які ў нядзелю ўчыніў наезд на прыпынак грамадзкага транспарту «Абласная бальніца». У выніку пацярпелі тры чалавекі, якія былі на прыпынку. Адна з пацярпелых памерла. За жыцьцё шасьцігадовай дзяўчынкі, у якой пераломы чэрапу і сківіцы, змагаюцца дактары, ейная маці знаходзіцца ў цяжкім стане. 26-гадовы кіроўца ўцёк зь месца здарэньня, пакінуўшы аўтамабіль. Ці быў ён у час ДТЗ у нецьвярозым стане, пакуль ня высьветлена.

### Разбойны напад на аддзяленьне «Беларусбанку» ў Заслаўі

Пагражаючы прадметам, падобным да пісталету, злачынца скраў з касы Заслаўскага аддзяленьня філіялу «Беларусбанку» амаль 1 800 даляраў. Падазраванага схапілі ў Менску. Гэта жыхар Заслаўя 1973 году нараджэньня. Яго раней ужо судзілі за рабаўніцтва, крадзеж, наўмыснае псаваньне маёмасьці, падробку дакумэнтаў.

### У Горадні маршрутку насадзіла на прыдарожную агароджу

Паводле папярэдняй інфармацыі, маршрутка не спынілася на чырвоны сыгнал сьвятлафору. Спрабуючы пазьбегнуць сутыкненьня зь легкавікам, маршрутка выехала на паласу сустрэчнага руху і ў выніку наткнулася на прыдарожную агароджу. Сталёвая труба агароджы прабіла радыятар і выйшла ў салён. Адзін з пасажыраў зь цяжкімі траўмамі зьмешчаны ў бальніцу.

### Ёсьць і ў нас бэйсбалісты

Паводле вынікаў 2008 году, «Берасьцейскія зубры» ўзьняліся на адну пазыцыю ў рэйтынгу 50 найлепшых бэйсбольных камандаў Эўропы і занялі 43-ю пазыцыю. Гэта адзіная беларуская каманда, якая ўвайшла ў топ-50. У 2008 годзе «Берасьцейскія зубры» сталі сяміразовымі чэмпіёнамі Беларусі па бэйсболе і занялі другое месца ў кваліфікацыйным Кубку Эўропы.

**Паводле ЛК, БелаПАН, БЕЛТА, s13.ru, darriuss.livejournal.com, gorliwy-litwin.livejournal.com**

# Ня ўсе пачвары жывуць у Афрыцы

Вось сымбаль твой!

Што здаецца нам пачварным? Зазвычай тое, што не адпавядае нашым уяўленьням пра звычайнасьць. Гэткім чынам, тое, што выглядае нязвыклым, можа ў нас асацыявацца менавіта з пачварнасьцю.

Чытаючы кнігі пра прыроду далёкіх краёў, гартаючы альбомы зь пярэстымі карцінкамі, напоўненыя рознымі пачварамі, мы ўяўляем далёкі сьвет тропікаў неверагодна прыгожым і неверагодна ж небясьпечным… Прыкладна так і ёсьць. Але ў тых краях жывуць цяпер мільярды, а месца для тамтэйшых пачвараў і пачварыкаў усё меней.

У нашай краіне людзей робіцца меней, зьдзічэлыя пусткі зарастаюць лесам, колісь асушаныя балаты ізноў становяцца часткаю прыроды. І тут, паміж *пустак, балот беларускай зямлі, на ўзьбярэжжы ракі шумнацечнай*, цікаўнаму воку можа трапіцца багата ўсяго незвычайнага, амаль пачварнага. Няма патрэбы ехаць у Афрыку.

Напрыклад, у нашай вадзе жывуць дзіўныя і нязнаныя для бальшыні суайчыньнікаў стварэньні — мянёгі. На першы погляд — рыба. Доўгае цела, плаўнікі, хвост. Праўда, у камплект уваходзіць яшчэ адзін орган, у рыбаў рэдкі — прысмочка. Ёю мянёга чапляецца за камяні на перакатах, а то і за больших рыбін... Аднак, усё па парадку.

У Беларусі іх аж тры віды: мянёга рачная (Lampetra fluviatilis), мянёга ручаёвая эўрапейская (Lampetra planeri) — у басэйнах Бугу, Дзьвіны, Нёману; мянёга ўкраінская (Lampetra mariae, або Eudontomyzon mariae) — у басэйнах Дняпра і Нёману. Дзіва што ў народных гаворках багата іхных назваў: верацёнка, верацяніца, віюн, відун, вугрыца, вярцёлка, сік, сіква ды розных іншых. Тры віды, што водзяцца ў нас, розьняцца крыху прапорцыямі, памерамі, і, перадусім, тэрмінамі нераставаньня. Іхная афарбоўка ад цёмна-шэрай да брунатнай, з мэталічным бляскам, а трыбушыска белаватае.

Паводле сваёй біялёгіі, яны ўжо амаль рыбы. Але не зусім. У іх лейкападобны рот, на дне прысмоктвальнага дыску; на языку і дыску рагавыя зубы. Нашая назва гэтае істоты пазычаная з польскай, куды патрапіла зь нямецкай, дзе назва мянёгі Neunauge, утвораная ад neun — дзевяць і auge — вока. Бо ў мянёгаў апроч сваіх двух сапраўдных вачэй ёсьць яшчэ сем вельмі падобных да іх шчэлепных адтулінаў, што разам утвараюць 9 «вачэй». У далёкіх афрыканскіх рэчках гэтыя істоты вырастаюць да палутара мэтраў. У нас яны шмат меншыя, ад 15 см. Хоць ля балтыйскіх берагоў сустрэць можна і мэтровыя экзэмпляры. Туды яны трапляюць, усмактаўшыся ў целы ласосяў, і жывуць на іх па некалькі гадоў. Яны ўгрызаюцца ў целы і іншых рыбаў, смокчуць кроў, выядаюць мышцы і вантробы. Кормяцца таксама беспазваночнымі, лічынкі — водарасьцямі, дэтрытам. А дарослыя экзэмпляры мянёгі ручаёвай не ядуць наагул! Іх харчавальная сыстэма пераўтвараецца ў рудымэнт у выглядзе непрахадной кішкі. Вагою такія мянёгі бываюць пад 3 кг.




МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Уедлівасьць, прычэплівасьць гэтых істотаў, як і іх форма паслужылі беларускаму фалькльору: *Тая дзеўка як мянёг, ледзь пад раніцу ўбег!* Астатнія жарты зазвычай ужо не для СМІ.

Хоць у Старым Запавеце наўпрост ёсьць забарона ўжываць у ежу стварэньняў бязь пёраў і без лускі, нашыя продкі, як і іншыя жыхары Паўночнае Эўропы, гэты запавет ігнаравалі. Як гэта ня есьці вангроў, ментузоў ды самоў? Не бяды, што яны без лускі. Гэтаксама ня мае лускі і мянёга. Пры тым яна лічыцца нагэтулькі смачнаю, што ангельскі кароль Генрых I у 1135 годзе проста памёр ад пераежэру тлустымі мянёгамі.

Надта ж ласыя да мянёгаў нашыя суседзі — латышы, у якіх гэтыя істоты лічацца ледзь не нацыянальнай стравою. Беларусы, аднак, мянёгаў ня надта шануюць. Па-першае — і так хапае чаго есьці. Па-другое — мянёгі назапашваюць у тканках атруту, у сваіх скурных залозах, якая трывае нават пры вялікай тэмпэратуры. Таму іх няможна варыць, бо атручваецца ўвесь навар! Адно што іх латва можна зшкварыць у вялікай колькасьці алею. Альбо замарынаваць, як робяць тыя ж латышы. А лепей ня брацца, як няма досьведу.

Пабачыць гэтыя дзіўныя стварэньні можна хіба падчас нерасту, вясною, калі яны зьбіваюцца ў вялікія гурмы на каменных перакатах з хуткай плыньню.

Сьпелая ікра мянёгаў жаўтавата-блакітная, роўная, нібы пацеркі, і яе можна нават убачыць скрозь трыбушок самкі. Пасьля нерасту мянёгі гінуць. Вылупіўшыся, лічынкі мянёгаў нагадваюць болей пругкіх паўпразрыстых чарвякоў, якія зарываюцца ў глей. Гэткія пескарыйкі праз колькі гадоў ператвараюцца ў дарослую істоту. А вось мэтамарфоза іхная адбываецца ўзімку, зазвычай на чацьвертым годзе жыцьця. Цела робіцца танчэйшым, адкрываюцца ўсе тры вокі, зьяўляецца яркая афарбоўка. Так што, коўзаючыся на тонкім лёдзе, будзьце ўважлівыя. Бо на вас з-пад ільду могуць глядзець мянёгі, сваім трэцім, цемянным, вокам.

**Сяргей Харэўскі**

**Мянёга (Lampetra)**

водная пазваночная жывёла клясы кругларотых, атраду мянёгавых, што падзелены на 3 семействы мянёгаў, 7 родаў, каля 30 відаў. Мянёга мае голае верацёнападобнае цела. Шкілет храстковы. Вочы разьвітыя, ёсьць трэцяе цемяннае вока, здольнае рэагаваць на сьвятло. Сэрца дзьвухкамэрнае. Сьпінных плаўнікоў 1 або 2. Прахадныя мянёгі жывуць у моры, на нераст мігруюць у рэкі; у жылых ручаёвых міног жыцьцёвы цыкл адбываецца ў прэснай вадзе.

У мянёгі лейкападобны рот, на дне прысмоктвальнага дыску; на языку і дыску рагавыя зубы. Пашыраная ва ўмераных марскіх і прэсных водах.




## ІМПРЭЗЫ

### Да дня народзінаў Уладзімера Караткевіча

**25 лістапада ў Віцебску** адбудзецца імпрэза, прымеркаваная да дня народзінаў пісьменьніка. **Збор у 18.15 ля помніка Караткевічу. Тамсама ў 18.40 у кінатэатры «Мір»** адбудзецца паказ фільму «Сівая легенда».

### Сустрэча з Кастусём Цьвіркам і Алесем Пашкевічам

**24 лістапада на сядзібе ТБМ** адбудзецца сустрэча зь пісьменьнікамі Кастусём Цьвіркам «Выдавецкія дасягненьні ў беларускай літаратуры» і Алесем Пашкевічам «Беларуская літаратура ў сваім часе». **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

### Выявы-2008

**6 сьнежня ў Тэатры расейскага рамансу (Чыгуначная, д.27, корп.2)** адбудзецца прэзэнтацыя літаратурна-мастацкага праекту «Выявы-2008», што мае на мэце прадставіць адразу некалькі кірункаў разьвіцьця найноўшай беларускай культуры: літаратурны, музычны і візуальны. Вас чакаюць выступленьні маладых паэтаў, якія будуць ня толькі чытаць вершы, але й пакажуць свае адмысловыя праграмы. **Пачатак а 18-й.** Квіткі 5000. Даведка і заказ квіткоў па т.: (029) 560-77-93, 135-44-95 або праз e-mail: vuavu@list.ru.

**29 лістапада а 13-й у рэстарацыі «Лісіная Нара» (Каліноўскага, 32)** — сустрэча з аўтарамі кнігі ў нефармальнай абстаноўцы.

## ВЫСТАВЫ

### Калекцыйная Спадчына Вялікага Княства

**25 лістапада ў галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43)** адбудзецца прэзэнтацыя кнігі «Калекцыйная Спадчына Вялікага Княства». У праграме — выступы аўтараў і выдаўцоў, аўтограф-сэсія. **Пачатак а 19-й.**

### Выстава Валер'я Лабка

**У галерэі візуальных мастацтваў NOVA (вул.Харужай, 16) да 14 сьнежня** працуе выстава памяці Валерыя Лабка «Вяртаньне. Крок другі».

### Успамін пра Дабраўляны

**У мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 6 сьнежня** працуе выстава «Ўспамін пра Дабраўляны» — па-мастацку ўвасобленыя ўражаньні ад сутыкненьня з творчай спадчынай беларускага мініятурыста Казімера Бахматовіча.

### Зямля і космас Язэпа Драздовіча

**У Доме-музэі I зьезду РСДРП (пр.Незалежнасьці, 31А) да 14 сьнежня** працуе выстава «Зямля і космас Язэпа Драздовіча».

### Пастэлі Анджэя Канечнага

**У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 47) да 30 лістапада** працуе выставаў пастэляў Анджэя Канечнага.

### Сучаснае ўжытковае мастацтва Японіі

**У Мастацкім музэі (Леніна, 20) да 24 лістапада** працуе выстава «Сучаснае ўжытковае мастацтва Японіі». Наведвальнікі выставы змогуць убачыць 64 творы 64 майстроў Японіі, трое зь якіх — Эры Саёка, Такуда Ясакіці і Ёсіда Міноры — уганараваныя тытулам «Жывы нацыянальны скарб Японіі».

### The best

**Да 30 лістапада ў «Падземцы»** працуе выстава «The best», дзе можна будзе ўбачыць інсталяцыю, жывапіс, каляжы, творы на любы густ.

### Творы Ізраіля Басава

**У Мастацкім музэі да 8 сьнежня** працуе выстава твораў Ізраіля Басава «Вяртаньне ў горад».

## КАНЦЭРТЫ

### Барока на Залатой Горцы

**У менскім касьцёле Найсьвяцейшай Тройцы (Сьвятога Роха) 29 лістапада** адбудзецца канцэрт старадаўняй музыкі эпохі Барока **Пачатак а 20-й.** Уваход вольны.

### Канцэрт французскай сьпявачкі Дафнэ

**1 сьнежня ў вялікай залі Філярмоніі** — канцэрт французскай сьпявачкі Дафнэ. **Пачатак а 19-й.**

### Крама

**21 лістапада ў «Рэактары» (Харужай, 29)** — вялікі сольны канцэрт Крамы. **Пачатак а 19-й.** Квіткі: 15000—40000.

### GARADzKIJA

**26 лістапада ў DAclub (Броўкі, 22)** — GARADzKIJA з прэзэнтацыяй новага альбому «Blin piersy». **Пачатак а 19-й.**

### Атмараві і Сяргей Пукст

**27 лістапада ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — граюць Атмараві і Сяргей Пукст. **Пачатак а 20-й**

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**21 (пт)** — «Сымон-музыка»
**22 (сб)** — «Вольга»
**23 (ндз)** — «Ідылія»
**24 (пн)** — «КІМ»
**25 (аўт)** — «Больш чым дождж»
**26 (ср), 27 (чц)** — «Дзеці Ванюшына»
**28 (пт)** — «Вечар»
**29 (сб)** — «Маэстра»
**30 (ндз)** — «Макбэт»
*ранішія спэктаклі*
**30 (ндз)** — «Афрыка»
*малая сцэна*
**24 (пн), 26 (ср)** — «Дамскае танга»

# На доўгай дарозе ад Белоруссии да Беларусі

**Здымкі фатографа «НН» Юліі Дарашкевіч можна пабачыць у будынку Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў Вільні. Адкрыцьцё экспазыцыі адбылося ў пятніцу, 14 лістапада. Выстава мае назву «Ад Белоруссіі да Беларусі».**

На ўсталяваньне аўтакратычнай дыктатуры беларускае грамадзтва адказала доўгатэрміновым, рацыянальным супрацівам. Нават праз 13 гадоў пасьля яе трыюмфу, замацаванага зманіпуляванымі рэфэрэндумамі, у Менску адбываюцца дэманстрацыі пратэсту. У розных гарадах кватэры й хаты, дзе працуюць інтэлектуальныя асяродкі, трымаюць свае дзьверы адкрытымі. Вольскі ладзіць канцэрты uncensored на хутарах і ў клюбіках, а дзе-небудзь у глушы Валожынскага раёну на бэтоннай клетцы аўтобуснага прыпынку можна натрапіць на падрыўны надпіс «Цені ня маюць голасу».

У XIX стагодзьдзі ў Беларусі адбываліся сялянскія бунты і шляхецкія паўстаньні за аднаўленьне грамадзянскіх правоў, забраных тыраніяй. Пад уплывам расейскай і ўкраінскай рэвалюцыяў, сусьветных войнаў і інсьпіраваныя суседнімі дзяржавамі, у XX стагодзьдзі ў Беларусі ўтвараліся партызанскія рухі. Аўтарытарызму XXI стагодзьдзя, такому ж непрымальнаму, процістаіць рух негвалтоўнага супраціву — зрух негвалтоўнага супраціву, сьвята, якое заўжды з намі.

Нават тыя, кім многія з вас, студэнтаў, прафэсараў, касмапалітаў, віленчукоў, пагарджаюць, ужо ня тыя. Яны выйшлі і не прыйшлі, яны мяняюць звычкі і ўзьнімаюць сьцягі, бог ведама якія сьцягі, часта яшчэ правінцыйна, неталерантна, спрагла, з жывёльным вігорам, як футбольныя фанаты на Кастрычніцкай — усё яшчэ Кастрычніцкай — плошчы. Яны таксама хочуць стаць героямі. Новая нацыянальная ідэнтычнасьць, часта інтуітыўная, уся з пачуцьця супярэчнасьці, яшчэ ружавеючы ад каляніяльных комплексаў, саромеючыся сваёй каштоўнасьці, выбудоўвае новую рэчаіснасьць.

Героі чакаюць сваіх фатографаў, унікальнае баіцца прайсьці незаўважаным, прайсьці незаўважаным азначае не ўваскрэснуць.

Буслы на даху разбуранага саветамі касьцёлу ў Зембіне, яскрыстае купальле ў Ракаве, подзьвіжная легенда зь пяску — гэта толькі фон, надвор'е, дэкор для шэксьпіраўскіх жарсьцяў.

Дарашкевіч спавядае клясыку. Яна фатограф клясычнага часу і таму аддае перавагу клясычнай кампазыцыі і рытміцы здымкаў. Схіліцеся перад гэтай клясыкай: цяжка быць фотарэпарцёрам у сваёй айчыне.

Дарашкевіч мае перавагу перад намі, бо яна раз на пяць гадоў можа зьняць Лукашэнку, але Сасіма і мы можам зьняць штодзень. Нудзізм (ня блытаць з нудызмам) чырвона-зялёных парадаў і яшчэ нясьмелы карнавал Дажынак — усё гэта наш час, гэтага больш няма анідзе, аніяк, аніколі. І Акрэсьціна — о! Акрэсьціна. Яны душаць, але нашы сьцягі высока.

Героі маюць права быць задакумэнтаванымі. Дарашкевіч стараецца іх разгадаць, высока іх узьнімае або фіксуе іхную мізэрнасьць, і гэтае інтэлектуальнае намаганьне робіць яе мастачкай.

***

**«Ад Белоруссіі да Беларусі», ЭГУ, будынак Унівэрсытэту Ромэрыса, вул. Валакупю, 5. Выстава працуе да 1 сьнежня.**

**Андрэй Дынько**



**Сваякі палітвязьняў гадзінамі чакаюць магчымасьці перадаць перадачу каля турмы на Акрэсьціна. Беларусь, Менск, сакавік 2006. Фота Юліі Дарашкевіч з выставы ў ЭГУ, Вільня.**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Кінафармат «4х4»

У засені кінафэстывалю «Лістапад» праходзіць традыцыйны менскі кінафармат, але гэта не замінае яму прапаноўваць вабныя стужкі. Галоўнай разынкай выглядае **«Крык мурашоў»** іранскага клясыка Махсэна Махмальбафа. Жанчына, якая верыць у Бога, закаханая ў атэіста. Яны бяруць шлюб, а потым выпраўляюцца ў Індыю. Так пачынаюцца іхныя прыгоды, насычаныя філязофскімі гутаркамі.

Італьянска-француская карціна Кшыштафа Занусі, пастаўленая паводле п'есы Рока Фаміліяры, **«Чорнае сонца»** — таксама пра маладых. Але сюжэт, заснаваны на сапраўдных падзеях, трагічнейшы. Драма разгортваецца на Сыцыліі ў 1980-я. Агата і Манфрэдзі — ідэальная пара і яны шчасьлівыя. Ідылію парушае выпадковы стрэл снайпэра. Сыцылійская традыцыя патрабуе ад маладой удавы помсты, але ў Кшыштафа Занусі на гэты конт свае меркаваньні.

Акрамя Занусі, яшчэ адно знаёмае імя ў кінафармаце — нямецкі лявак Ганс Вайнгартнэр. Ягоная новая стужка — **«Прачысьці мазгі»**. Цынічны тэлепрадусар, які зрабіў кар'ёру на ідыёцкіх размоўных шоў, сустракае дзяўчыну, што гарыць помстаю. Праз перадачы прадусара засіліўся ейны дзядуля — і галоўны герой, каб апраўдацца перад жанчынаю сваёй мары, стварае падпольную групу, што абвяшчае вайну тэлевізіі. Ролю прадусара сыграў папулярны харызматычны актор Морыц Бляйбтрой.

Чацьверты фільм — нарвэская камэдыйная драма **«О'Хортэн»**, што атрымала нарвэскі прыз «Аманда» за найлепшы гук і намінавалася на «Гран-пры» кінафэсту ў Фландэрсе.

Фільмы кінафармату дэманструюцца ў кінатэатрах «Перамога», «Цэнтральны», «Аўрора», «Мір» з 20 па 23 лістапада.

**Андрэй Расінскі**

### Дні польскага кіно

**З 26 да 30 лістапада** ў кінатэатры «Цэнтральны» (пр.Незалежнасьці, 43) — Дні польскага кіно. Пачатак усіх сэансаў у 18.30.

**26 лістапада** — анімацыйная праграма: «Сола на цэліне», «Кроткая», «Вэлагонкі», «Настройка інструмэнтаў», «Ichthys», «Каракас», «Пеця і воўк».

**27 лістапада** — «Надвор'е на заўтра».

**28 лістапада** — «Карагод».

**29 лістапада** — «Хто ніколі ня жыў».

**30 лістапада** — «Рэзэрвацыя».

## ФОТАФАКТ




**25 гадоў таму за такое б далі 25 гадоў. Сёньня ж выява правадыра пралетарыяту ператварылася ў аб'ект для беларускіх авангардных дызайнэраў. Яны прадстаўлялі калекцыі 16 лістапада ў Менску, падчас фэстывалю моды «Мамант-2008».**

## ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Усім чыноўнікам — прайсьці акторскія курсы

Стэнаграма нарады пра эфэктыўнасьць мераў па барацьбе зь неэфэктыўнымі нарадамі. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Такім чынам, вынікі нарады выявілі, што сярод нашых кіраўнікоў пануе фармалізм. Хоць я дастаткова доўга чакаў, калі будуць выкананыя мае даручэньні па татальным выкараненьні з жыцьця нашага грамадзтва ліха, імя якому — неэфэктыўныя нарады па эфэктыўнасьці мераў барацьбы з чым бы там ні было, — усё застаецца як і раней. Наша краіна займае высокую пазыцыю ў сусьветных рэйтынгах па ўзроўні эфэктыўнасьці правядзеньня нарадаў па эфэктыўнасьці мераў па барацьбе з чым бы там ні было і мы павінныя не дапусьціць адваротнага!

Мне ўвесь час дакладваюць: там затрымалі ўрача, які правёў дрэнную нараду па эфэктыўнасьці мераў па барацьбе з грыпам; там ідэоляг ЖЭСу арганізаваў слабую нараду па праблемах вывазу сьмецьця. Аднак ніводнага слова ня кажуць пра асобаў з найвышэйшых эшалёнаў улады.

Хоць факты відавочныя. Колькі разоў я прасіў правесьці на рэспубліканскім узроўні добрую нараду наконт махінацыяў з кватэрамі? І што? Думаеце, вядучы, як Карабас-Барабас, гнеўна круціў вачмі і кідаўся пагрозамі? Не! Усё прайшло ціха, пасядзелі, пакалякалі, як там БАТЭ згуляў, і разышліся. І гэта яшчэ ня ўсё! Цягам усёй нарады ні разу не прагучаў выраз: «І меры будуць прынятыя жастачайшыя». Людзі ж падумаюць, што ў нас урад нічым не займаецца!

Абсалютна запушчаная справа ў галіне мімікі і жэстыкуляцыі. Дзяржкантроль мяне пэрыядычна інфармуе, што некаторыя губэрнатары падчас нарадаў ня стукаюць па стале кулаком і ня робяць жудасных грымасаў! Не кажу ўжо пра тэмбр голасу. Ёсьць у нас чыноўнікі, якія на нарадах гавораць фальцэтам! Пра што тут можна казаць?

А кадравы пратэкцыянізм? Чаму падчас нарады пра эфэктыўнасьць мераў па барацьбе за нарыхтоўку кармоў кіраўнік абласной вэртыкалі не наехаў на свайго зама? Бо гэта ягоны швагер у чацьвертай стрэчы, як дакладае Дзяржкантроль. Галоўнае — пакрыць сваіх!

Але ня выйдзе! Таму генпракурору загад — прымусіць усіх чыноўнікаў прайсьці акторскія курсы, абнавіць лексыкон фразамі кшталту «па сьценцы ўсіх размажу, галовы палятуць, рогі паадшыбаю, калі плян праваліце». Тэрмін выкананьня — дзесяць дзён. Хачу падкрэсьліць — усе, хто думае, што гэтай нарадай усё абмяжуецца, жорстка памыляюцца. Я асабіста буду праглядаць выпускныя акторскія працы ўсіх кіраўнікоў аблвыканкамаў, і калі скажу «ня веру» — літасьці не чакайце.

Інакш стабільнасьць, якую мы будавалі гадамі, можа абрынуцца ў адначасьсе.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Па мясьцінах Слуцкага збройнага чыну.** 23 лістапада — традыцыйны выезд па мясьцінах Слуцкага збройнага чыну: вёскі Семежава, Грозава, горад Слуцак. У Слуцку адбудзецца экскурсія і паказ дакумэнтальнага фільму «Слуцкі збройны чын». Для атрыманьня падрабязнай інфармацыі і запісу на паездку зьвяртайцеся па тэлефоне (044) 763–42–51 (Антон)

**Запрашаем у падарожжа** 23 лістапада (нядзеля) па маршруце: Менск—Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзясятнікі—Валожын—Менск. 28 лістапада — 1 сьнежня: Львоў—Луцк—Уладзімер-Валынскі—Зімнэ. Т.: (029) 622–57–20, (029) 509–12–16, (029) 110–19–28; Zmikas1@tut.by

**Мясьцінамі Караткевіча.** У гонар дня народзінаў Уладзімера Караткевіча ладзіцца вандроўка па дарагіх сэрцу мясьцінах пісьменьніка. Выезд зь Менску 22 лістапада, 7.30 раніцы. Больш падрабязная інфармацыя: (029)761–07–94 (Кірыла).

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

### Дзякуй

**Мікалаю Х., Дзьмітрыю П., Генадзю Л.** з Гомелю.
**Івану Д.** зь Мядзельскага раёну.
**Аляксандру А., Сяргею К.** зь Пінскага раёну.
**Паўлу Л.** з Хойніцкага раёну.
**Натальлі Г.** з Салігорскага раёну.
**Міхаілу Ш., Міхаілу Ш.** з Клімавіцкага раёну.
**Вячаславу С., Лідзіі А., Алесю Б.** з Баранавіцкага раёну.
**Ірыне З.** з Смалявіцкага раёну.
**Дз. С., Аляксандру К., Ларысе Л., Віталю Б., Генадзю К., Аляксею П.** з Горадні.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Гэту сваю гутарку імпэратар дазволіў надрукаваць у газэтах, думаючы, што Англія гляне прыхільным вокам на яго стараньне дзеля карысьці яе. Але выйшла саўсім ня тое, на што Вільгельм меў надзею: уся Эўропа, у тым і сама Англія, падняла крык, што немцам ня можна верыць, бо ў палітыцы яны круцяць, ашукваюць. Усе пачалі насьміхацца над немцамі і іхняй палітыкай.

**«Наша Ніва». №23 ад 20 лістапада. 1908**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 301220628014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 19.11.2008.
Замова № 6418.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.